

«ЖЫХАРЫ» ВІРТУАЛЬНАГА СВЕТУ

ЧЫРВОНКА

ПАРКУР: ПАЛЁТ НАРМАЛЬНЫ!

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 178 (29045)


# НА ВЯРШЫНІ ВЕРАСНЯ



Фота БелТА.

Дзесьці сёлета яблыкі не ўрадзілі, а ў садах Талачынскага кансервавага завода ўраджай багаты: ужо сабралі паўтары тысячы тон яблыкаў і груш, і гэта толькі палова ад запланаванага. Нават студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта на дапамогу паклікалі. Па пяцікурсніку Анатолю СТАРАННІКУ *(на фота)* відаць, што такі працоўны дэсант маладым людзям толькі ў радасць.

## ЦЫТАТА ДНЯ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Беларусь прапануе правесці ў сябе канферэнцыю высокага ўзроўню па тарфяніках. У рамках гэтага мерапрыемства краіны і агенцтвы змаглі б ацаніць ступень сінергіі міжнародных шматбаковых прыродаахоўных пагадненняў, якія ў той ці іншай ступені датычацца тарфянікаў, выпрацаваць канкрэтныя сумесныя крокі па прывядзенні дэкларацый у дзеянне, прапанаваць фінансавыя механізмы, якія спрыялі б захаванню і аднаўленню тарфянікаў і скарачэнню на гэтай аснове выкідаў парніковых газаў. На наш погляд, прыцягненне ўвагі да гэтага пытання — вельмі своечасовы крок, паколькі тарфянікі з'яўляюцца найбольш магутным генератарам змяншэння выкідаў $CO_2$. Супастаўнага эфекту не дае ні адно з прыродаахоўных мерапрыемстваў».*

## КОРАТКА

- **ЕС рыхтуе для Беларусі новую праграму ў сферы рэгіянальнага развіцця і падтрымкі мясцовых ініцыятыў.**
- Славакія плануе інвеставаць 15—20 млн еўра ў сельскагаспадарчыя праекты ў Беларусі.
- **Спартыўныя гульні сярод пацыентаў з сардэчнай недастатковасцю пройдуць у Мінску.**
- Сезон сельскагаспадарчых кірмашоў стартуе ў Мінску 28 верасня.
- **IKEA мае намер у 2021 годзе нарасціць пастаўкі беларускіх тавараў да 300 млн еўра.**
- На ўсходзе Індыі ад удараў маланак за суткі загінула 17 чалавек.

Як гэта будзе

## КОЛЬКІ НАС І ЯКІЯ МЫ?

На гэтыя пытанні мы ўсе разам адкажам у кастрычніку падчас агульнарэспубліканскага перапісу

**Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА адзначае, што іх ведамства разлічвае перапісаць максімальную колькасць грамадзян з дапамогай укаранёных інавацый, і расказала пра тое, які працэнт можна лічыць выдатным вынікам. Бо адна з галоўных задач мерапрыемства — даведацца пра максімальна дакладную колькасць насельніцтва краіны.**

Цяпер рыхтуецца загад па зацвярджэнні мэтавых паказчыкаў для ацэнкі праўдзення і якасці перапісу. Для сябе Белстат вызначыў такія паказчыкі: больш за 98 % перапісаных — выдатна, 95—98 % — добра, менш за 95 % — здавальняюча. «Удзельная вага колькасці насельніцтва, перапісанага праз інтэрнэт: больш за 25 % — выдатна, 20—25 % — добра, менш за 20 % — здавальняюча», — растлумачыла Іна Мядзведзева. Дарэчы, паводле папярэдніх звестак, на 1 жніўня ў нашай краіне пражывала 9 мільёнаў 454 тысячы 100 чалавек.

### Унікальная інфармацыя дапаможа краіне развівацца

Вынікі перапісу даюць гранічна дакладную інфармацыю аб колькасці насельніцтва, хатніх гаспадарак, сем'ях (колькі іх, якія яны, уся дэмаграфічная раскладка). І гэта дазваляе карэктна выбудаваць работу ўсёй дзяржавы.

СТАР. 2

Малая радзіма

## Жураў лятуць да жураўлін

Як жывуць і адпачываюць людзі на балоце



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Згодна з вядомымі радкамі Алеся Ставера, з выраю жураўлі ляцяць на Палессе. А вось збіраюцца яны ў вырай на поўначы Беларусі. Даспадобы ім Мёршчына Віцебскай вобласці. Менавіта там знаходзіцца адно з любімых для жураўлёў месцаў — маляўнічы заказнік Ельня, адзін з найбуйнейшых комплексаў балот са шматлікімі азёрамі. Кожны год некалькі тысяч птушак спыняюцца там падчас восеньскай міграцыі. Таму да іх асаблівае стаўленне ў Мёрскім раёне. Яшчэ адзін сімвал краю — журавіны, Мёры нават называюць журавіннай сталіцай Беларусі. Сем гадоў таму жыхары вырашылі прысвяціць гэтым знакавым прадстаўнікам флоры і фаўны рэгіёна штогадовае экалагічнае свята. Назвалі яго проста — «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю». У мінулую нядзелю на фестываль завітала карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ЗА ТРЭЦЯЕ І НАСТУПНЫХ

**Тэрмін дзеяння праграмы сямейнага капіталу падаўжаецца з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года з пашырэннем кірункаў яго датэрмінова выкарыстання зыходзячы з інтарэсаў шматдзетных сем'яў. Гэта прадугледжана Указам № 345 «Аб сямейным капітале», які падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Фарміраванне сямейнага капіталу будзе весціся ў беларускіх рублях, з базавым памерам на 1 студзеня 2020 года Br22,5 тыс. Пры гэтым для захавання пакупной здольнасці памер сямейнага капіталу будзе штогод індэксавацца ў залежнасці ад тэмпаў росту спажывецкіх цэн.

Указам таксама прадугледжана, што права на прызначэнне сямейнага капіталу маюць грамадзяне Беларусі пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга ці наступных дзяцей, калі з улікам народжанага (усыноўленага, удачаронага) дзіцяці ў сям'і выхоўваецца не менш за трое дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

Прызначэнне сямейнага капіталу ажыццяўляецца пры звароце ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Права на зварот па прызначэнне сямейнага капіталу можа быць рэалізавана на працягу шасці месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга і наступных дзяцей, а права на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу — па заканчэнні 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем (усынаўленнем, удачарэннем) якога сям'я набыла права на прызначэнне сямейнага капіталу.

Пасля заканчэння 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем (усынаўленнем, удачарэннем) якога сям'я набыла права на сямейны капітал, сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя, фарміраванне назапашвальнай пенсіі маці.


Фота БелТА.

Датэрмінова сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны на паляпшэнне жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку па паляпшэнню жыллёвых умоў; атрыманне паслуг у сферы адукацыі (для аплаты навучання пры атрыманні членамі сям'і сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі); атрыманне платных медыцынскіх паслуг, што аказваюцца арганізацыямі аховы здароўя.

Парадак і канкрэтныя мэты выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу, а таксама парадак і ўмовы іх датэрмінова выкарыстання вызначаюцца Саветам Міністраў.

Гэтыя сродкі будуць размяшчацца на ўклады (дэпазіты) «Сямейны капітал» у ААТ «АСБ Беларусбанк».

Сродкі, па якія грамадзяне не звярнуліся на працягу трох гадоў пасля заканчэння 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем (усынаўленнем, удачарэннем) якога сям'я набыла права на прызначэнне сямейнага капіталу, альбо не выкарыстаныя на працягу пяці гадоў пасля падачы заявы аб распараджэнні імі, падлягаюць вяртанню ў рэспубліканскі бюджэт.

Для забеспячэння роўных магчымасцяў для шматдзетных сем'яў, якім сямейны капітал прызначаны раней (па праграме 2015—2019 гадоў), указам ім таксама дадзена права на датэрміновае выкарыстанне гэтых сродкаў па пералічаных кірунках.

## «Шчыт Саюза — 2019»: актыўная фаза скончана

**Учора на палігоне блізу вёскі Муліна завяршылася актыўная фаза сумеснага аператыўнага вучэння Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Шчыт Саюза — 2019». Злучэнні і воінскія часці на практыцы адпрацавалі пытанні па вядзенні баявых дзеянняў за ўтрыманне абарончых рубяжоў і стабілізацыі абстаноўкі, умовы якой змяняліся паводле задумы вельмі хутка. Яны адбілі ўдары сродкаў паветранага нападу. Быў высаджаны паветраны дэсант.**

Вайскоўцы актыўна выкарыстоўвалі авіяцыю і беспілотныя лятальныя апараты. Ваенныя інжынеры прараблі праходы ў мінных палях. Акрамя таго, была паспяхова фарсіравана водная перашкода.

Кіраўнік вучэння ад Беларусі, **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ** падкрэсліў:

— Створана дынамічная абстаноўка, якая прымушае камандзіраў прымаць неардынарныя рашэнні ў самыя кароткія тэрміны. Мы сыходзім ад азбукі і пераходзім да дзеянняў, якія дазваляюць выконваць пастаўленыя задачы з найбольш высокай якасцю. Нягледзячы на тое, што ідзе моцнае радыёэлектроннае прыгнятанне, сістэма кіравання паказвае досыць высокую ступень устойлівасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# КОЛЬКІ НАС І ЯКІЯ МЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля перапісу Белстат дасць унікальную інфармацыю аб тым, як размешчаны працоўныя рэсурсы, чаму насельніцтва не працуе ў адным горадзе, а едзе ў іншы, і шмат што яшчэ. «Раз у дзесяць гадоў мы атрымліваем інфармацыю аб фактычным беспрацоўі. Так, штоквартальна публікуем звесткі выбарачнага абследавання па вывучэнні занятасці, у якім удзельнічае невялікі працэнт насельніцтва. Але гэтыя лічбы моцна адрозніваюцца ад фактычных. Самае галоўнае, што мы атрымліваем, — прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Наступныя дзесяць гадоў будзем рабіць разлікі і прагнозныя параметры, грунтуючыся на даных перапісу», — адзначыла важнасць правядзення працэдуры Іна Мядзведзева.

Пры гэтым яна выказала пазіцыю, што ў нашай краіне няма неабходнасці ўводзіць нейкія штрафы ў дачыненні да тых, хто катэгарычна адмаўляецца ад удзелу ў мерапрыемстве. Тым больш што пробны перапіс паказаў адкрытасць насельніцтва. А між іншым, у некаторых краінах Еўразаюза прадугледжаны вельмі вялікія штрафы тым, хто адмаўляецца.

### Тры спосабы перапісу

Перапіс насельніцтва пройдзе з 4 да 30 кастрычніка. Рэспандэнтам прапануюць адказаць на 49 пытанняў, у тым ліку аб асноўных дэмаграфічных і нацыянальна-этнічных характарыстыках, міграцыйнай актыўнасці, адукацыі, крыніцах сродкаў на існаванне, занятасці, колькасці дзяцей, жыллёвых умовах, гаспадарчай дзейнасці. «Перапісацца» можна будзе адным з трох спосабаў: самастойна і ў зручны час запоўніць апытальныя лісты праз інтэрнэт, на стацыянарных участках, у сябе дома падчас вуснага апытання перапісчыка.

Ужо цяпер месцы для стацыянарных участкаў амаль усюды вызначаны. Інфармацыя аб адрасах будзе размешчана на сайце Белстата, тэрытарыяльных органаў дзяржаўнай статыстыкі, верагодна, па просьбе камітэта праінфармуюць жыхароў раёнаў і сайты райвыканкамаў. Таксама ёсць дамоўленасць аб апавяшчэнні насельніцтва праз жыроўкі.

Акрамя таго, паралельна з 4 да 18 кастрычніка будуць працаваць мабільныя стацыянарныя ўчасткі. Гэта значыць, што ўсе арганізацыі, якія пажадаюць прыняць у сябе перапісчыкаў, могуць накіраваць заяўкі. І такіх ужо цяпер аказалася нямала. Іна Мядзведзева дадала, што Белстат нацэліў органы дзяржаўнага кіравання на перапіс у інтэрнэце. Дарэчы, гэта стане зручным спосабам і для беларусаў, якія часова знаходзяцца за мяжой. Бо калі чалавек пражывае менш за год за межамі краіны, «перапісацца» ён абавязаны, але гэта могуць зрабіць за яго і паўналетнія сваякі.

Рыхтуюцца таксама перапісчыкі для працы ў арганізацыях аховы здароўя, сацыяльнага абслугоўвання, закрытых установах. Гэта работнікі згаданых арганізацый, якія пройдуць навучанне з 17 верасня ў тэрытарыяльных органах дзяржаўнай статыстыкі. Усяго ў спецыялізаваных, спецыяльных установах закрытага і адкрытага тыпаў будзе працаваць каля 2,7 тысячы перапісчыкаў.

Падлічана, што ўсе новыя падыходы да правядзення перапісу дапамогуць скараціць у тры разы колькасць перапіснога персаналу, амаль у столькі ж разоў паменшыць час запаўнення перапіснога ліста. А гэта дазволіць у канчатковым выніку павысіць якасць працэдур. Дапаможа пры правядзенні перапісу і спецыяльны кол-цэнтр, у які можна звярнуцца з любымі пытаннямі па тэме. Ужо цяпер працуе промасайт перапісу па адрасах www.перапіс.бел і www.census.by, дзе можна азнаёміцца з данымі кампаніі 2009 года і знайсці карысную інфармацыю і парады.

### А як у інтэрнэце

Пры падрыхтоўцы да перапісу Белстат вывучыў перадавы сусветны вопыт. Спецыялісты прыйшлі да высновы, што няма неабходнасці рыхтаваць відэаролік, які тлумачыць паслядоўнасць яго праходжання па інтэрнэце. Замест гэтага на сайце перапісу размесцяць прэзентацыю, дзе будуць пазначаны паслядоўнасць дзеянняў і пытанні, якія могуць паўстаць у карыстальнікаў.

Падчас перапісу па інтэрнэце выкарыстоўваецца рэсурс міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі (МСІ). Прычым скарыстацца ім могуць як зарэгістраваныя, так і незарэгістраваныя карыстальнікі. Першыя — увайшоўшы з дапамогай лагіна і пароля, другія — праз СМС-код (паказаўшы свой ідэнтыфікацыйны нумар і нумар мабільнага тэлефона). Зрэшты, паколькі другі спосаб больш хуткі, скарыстацца такім аднаразовым паролем можа і зарэгістраваны карыстальнік.

Пасля працэдуры ўваходу чалавек атрымае перадзапоўнены перапісны ліст, дзе ўжо будуць пазначаны яго прозвішча, імя, імя па бацьку, асабісты нумар, дата і месца нараджэння. Застанецца дапоўніць яго іншай інфармацыяй.

**Намеснік начальніка аперацыйнага ўпраўлення — начальнік аддзела міжбанкаўскай ідэнтыфікацыі і блокчэйна ААТ «Нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя «Адзіная разліковая і інфармацыйная прастора» Ірына ІГНАТОВІЧ** адзначыла, што паўдзельнічаць у перапісе па інтэрнэце змогуць толькі тыя грамадзяне, даныя якіх ёсць у сістэме МСІ. У ёй сёння ўтрымліваецца каля 7,5 мільёна ўнікальных запісаў аб кліентах беларускіх банкаў. Калі чалавек ніколі не сутыкаўся з апошнімі, не атрымліваў банкаўскую пластыкавую картку, тады інтэрнэт вам не дапаможа.

У сувязі з тым, што гэта сістэма фарміруецца данымі, якія даюць банкі пры абслугоўванні кліентаў, тут трэба паказваць той нумар мабільнага тэлефона, які вы павдамлялі супрацоўніку банка. «Калі вы хочаце папярэдне паглядзець, якія даныя захоўваюцца ў сістэме, ужо цяпер можна зарэгістравацца ў МСІ і ўбачыць іх. Дарэчы, праходзіць рэгістрацыю на нашым сайце можна і з выкарыстаннем адраса электроннай пошты. Гэта важна для тых, хто з нейкіх прычын не падключаны да беларускага апаратара сотавай сувязі», — адзначыла Ірына Ігнатовіч.

**Намесніца старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Жанна ВАСІЛЕЎСКАЯ** звярнула ўвагу, што не варта блытаць паняцці «хатняя гаспадарка» і «сям'я». Пры запаўненні апытальніка ўлічваецца, што ў адным памяшканні можа знаходзіцца больш як адна хатняя гаспадарка. Па кожнай з іх інфармацыя запаўняецца па парадку: склад кожнай хатняй гаспадаркі, затым асабістыя даныя ўсіх членаў сям'і. Калі некалькі паўналетніх членаў сям'і захочуць самастойна скарыстаць праграмай у інтэрнэце, дубляванне інфармацыі будзе выключацца.

Пры запаўненні апытальнага ліста самастойна прадугледжаны падказкі, якія будуць усплываць у выпадку, калі чалавек не зразумеў пытання. Таксама закладзены лагічны і арыфметычны кантроль: сістэма альбо падкажа рэспандэнту, што ён дзесьці дапусціў памылку, альбо адразу заблакуе пераход да наступнага пытання, пакуль нестыкоўка не будзе выпраўлена.

І яшчэ. Нікуды не трэба спяшацца. Заўсёды можна вярнуцца да запаўнення перапіснога ліста, калі чалавек перапыніўся, альбо памяняць ужо ўнесеныя даныя ўліковага запісу — усе яны захоўваюцца да завяршэння працэдуры. «У выпадку калі ў чалавека няма сельгасучастка, а склад сям'і — тры-чатыры чалавекі, час запаўнення складзе ў сярэднім 10—15 хвілін. Тут многае залежыць ад вопыту запаўнення апытальнікаў у інтэрнэце. Але...

Скончыўшы працэдуру, чалавек захоўвае і адпраўляе сваю анкету. Усё, цяпер інфармацыя пра вас сышла ў засакрэчаны сервер і дастаць яе адтуль проста так не ўдасца. Пасля гэтых дзеянняў кліент атрымае апавяшчэнне — падзяку за ўдзел, а таксама пасведчанне аб тым, што прайшоў апытанне (у дакуменце пазначаны адрас яго пражывання). І ў выпадку, калі ўсё ж такі да рэспандэнта пазней прыйдзе дадому перапісчык, яму дастаткова паказаць гэта пасведчанне як доказ.

### Давярай, але правярай

Спецыялісты расказвалі і пра тое, як не стаць ахвярай ашуканцаў, якія прыкідваюцца перапісчыкамі.

Бліжэй да гадзіны пік міліцыя будзе праводзіць работу па папярэджанні насельніцтва аб ілжэперапісчыках. «Разам з намі яны будуць такія факты адсочваць. Я ж хачу папярэдзіць людзей ні ў якім разе не даваць інфармацыю па тэлефоне. Пры правядзенні пробнага перапісу ў нас былі выпадкі, калі несумленныя людзі спрабавалі атрымаць пэўную інфармацыю такім чынам. Дык вось — Белстат па тэлефоне перапіс не праводзіць», — падкрэсліла Іна Мядзведзева.

Калі вы вырашылі, што перапісчык прыходзіць да вас дадому, тады рэспандэнту трэба запатрабаваць у яго пасведчанне і пашпарт. У гэтым выпадку вы павінны абавязкова зверыць даныя яго пашпарта з данымі ў пасведчанні. Калі ёсць сумненні, можна патэлефанаваць у кол-цэнтр перапісу або ў органы статыстыкі і ўдакладніць прозвішча і даныя. Перастрахавацца ніколі не будзе лішнім. Калі перапісчыкі пойдуць па дамах — а гэта будзе з 21 да 30 кастрычніка — насельніцтва да гэтага часу ў максімальнай сваёй масе ўжо вызначыцца з формай праходжання перапісу.

Акрамя таго, у прыватным сектары падчас перапісу будуць працаваць участковыя і нарады міліцыі, каб адсочваць магчымую дзейнасць ашуканцаў. Такія трывожныя сігналы будуць мець прыярытэт пры разглядзе. Гэта дадаткова засцеражэ і саміх перапісчыкаў.

Першую інфармацыю аб колькасці насельніцтва Белстат дасць у лютым наступнага года. Разгорнутую па сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках, у тым ліку фактычным беспрацоўі, — у ліпені 2020 года, а інфармацыю па самай складанай частцы апытальніка — дзейнасці насельніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі — у ліпені 2021 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Рух для ўсіх

# НА КАРЫСЦЬ СВАЙМУ ЗДАРОЎЮ



**Па 22 верасня па ўсёй краіне праходзіць Еўрапейскі тыдзень мабільнасці, у тым ліку гарадская экалагічная акцыя «Дзень без аўтамабіля». У Беларусі мерапрыемства праводзіцца штогод, пачынаючы з 2015 года.**

**Кансультант упраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аксана ЮЧКАВІЧ** расказала, што асноўнай тэмай 2019 года з'яўляецца тэма развіцця веласіпеднага і пешаходнага руху ў гарадскім асяроддзі.

— Вельмі важна прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы залішняга выкарыстання асабістага транспарту і, як вынік, забруджвання паветра. Цікавасць да мерапрыемства расце, павялічваецца і колькасць удзельнікаў мерапрыемства. Сёлета на беларускім Еўрапейскім тыдні мабільнасці зарэгістравалася рэкордная колькасць гарадоў — 76, летась іх было 66. Праблема, якая падымаецца дзякуючы яму, цяпер вельмі актуальная: 63 працэнты выкідаў, якія забруджваюць атмасфернае паветра, прыпадае на аўтатранспарт, гэта амаль дзве трэціны ўсіх выкідаў. У сталіцы лічба дасягае 88 працэнтаў. Традыцыйна Еўрапейскі тыдзень мабільнасці завяршаецца акцыяй «Дзень без аўтамабіля», якая пройдзе 22 верасня. Зразумела, што не ўсе кіроўцы цалкам адмовяцца ад выкарыстання асабістага транспарту і аддадуць перавагу грамадскаму. Аднак цяпер у краіне актыўна развіваюцца і альтэрнатыўныя яго віды: сегвеі, самакаты, веласіпеды. Не трэба забываць і пра пешыя прагулкі.

Акцыя праводзіцца не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах краіны: Брэсце, Смаргоні, Ваўкавыску, Баранавічах, Вілейцы і іншых. Напрыклад, у Рэчыцы кіроўцам, якія адмовяцца ад праезду на асабістым транспарце, будуць прапанаваны білеты ў экалага-біялагічны музей, які ім можна будзе наведаць бясплатна.

**Старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сцяпан ДУБНІЦКІ** адзначыў:

— Цяпер у сталіцы праводзіцца работа па змяншэнні вышыні бардзюрнага каменя па найбольш запатрабаваных маршрутах веласіпеднага руху і па размяшчэнні велапаркоўак. 22 верасня з 14 да 21 гадзіны прадугледжана экалагічная акцыя на вуліцы Кастрычніцкай, уваход бясплатны. Там будуць арганізаваны майстар-класы, конкурсы, сярод якіх — на лепшы падсвечаны веласіпед, прадугледжана дзіцячая пляцоўка, работа фотазоны, выстаўкі рамеснікаў. З 17 да 21 гадзіны пройдзе канцэртная праграма, а пасля — вячэрні велапрабег падсвечаных веласіпедаў. Усім удзельнікам можна будзе ўпрыгожыць свой транспарт рознакаляровымі стужкамі, каб яскрава праехаць па праспекце і не застацца незаўважанымі. У прабегу могуць удзельнічаць не толькі веласіпеды, але і самакаты, сегвеі і іншыя альтэрнатыўныя віды транспарту. Акрамя таго, можна пракаціцца са сваімі жывёламі. Старт на вуліцы Кастрычніцкай, далей маршрут пройдзе па вуліцах Трасцянецкай, Аранскай, Свярдлова, праспекце Незалежнасці. Фініш — на вуліцы Якуба Коласа. Дарожны рух аўтамабіляў на гэты час будзе абмежаваны.

**Інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Раман ЛАШКЕВІЧ** расказаў, што падчас правядзення Еўрапейскага тыдня мабільнасці будуць дзейнічаць абмежаванні на рух па вуліцы Кастрычніцкай ад дома № 16/1 да № 16/25 з шасці гадзін раніцы да поўначы. Паэтапнае абмежаванне руху будзе ажыццяўляцца падчас велапрабегу.

**Эксперт праекта ПРААН «Зялёныя гарады» па правядзенні Еўрапейскага тыдня мабільнасці Кірыл СІНЮЦІЧ** адзначыў: штогод мерапрыемства падтрымліваюць прыблізна 50 краін, Беларусь знаходзіцца на дзявятым месцы па масавасці.

Адным з арганізатараў Еўрапейскага тыдня мабільнасці з'яўляецца арганізацыя «Мінскае веласіпеднае таварыства». Аб праграме мерапрыемстваў расказала яго прадстаўніца — **PR-спецыяліст Дар'я КАСКО**:

— 20 верасня для жыхароў сталіцы пройдзе акцыя «На работу на веласіпедзе». З сямі гадзін раніцы да паловы адзінаццатай у розных пунктах горада (каля стэлы «Мінск — горад-герой», галоўнага ўваходу ў Батанічны сад, «Мінск-Арэны», Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра, каля ўнівермага «Беларусь», а таксама на праспекце Пушкіна, 85) валанцёры будуць раздаваць усім веласіпедыстам смачную садавіну.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Парламенцкія выбары ў Ізраілі: без адназначнага пераможца



Прэм'ер-міністр Ізраіля Беньямін Нетаньяху ў найбліжэйшыя дні пачне перагаворы па стварэнні «моцнага сіянісцкага ўрада», але лічыць неабходным дачакацца публікацыі афіцыйных вынікаў парламенцкіх выбараў, якія адбыліся 17 верасня.

Прэм'ер падкрэсліў, што Ізраіль стаіць перад «вялізнымі выклікамі». «Мы пастаянна супрацьстаім і дзейнічаем супраць Ірана без страху, хутка прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прадставіць свой план (па ўрэгуляванні палесціна-ізраільскага канфлікту. — **Рэд.**), які вызначыць будучыню Ізраіля, і мы павінны гарантаваць, што нашы дасягненні, дзеля якіх мы працавалі, будуць захаваныя», — працягнуў ён.

Экзітполы па выніках праведзеных у аўторак паўторных выбараў у Кнесет 22-га склікання не выявілі адназначнага пераможца, канстатуе дзяржаўнае радыё Ізраіля Кап. Па яго падліках, блок правых і рэлігійных партый, на які мае намер абаперціся прэм'ер-міністр Беньямін Нетаньяху, атрымлівае (без удзелу партыі «Наш дом — Ізраіль» Авігдора Ліберман) ад 54 да 56 са 120 месцаў у парламенце, у той час як для фарміравання кааліцыі неабходна як мінімум 61 крэсла.

## Іран накіраваў ЗША ноту з аспрэчваннем сваёй датычнасці да нападаў на Саудаўскую Аравію

Іранскія ўлады накіравалі ЗША ноту, у якой абверглі дачыненне Ірана да нападаў на нафтавыя аб'екты ў Саудаўскай Аравіі. Пра гэта паведаміла агенцтва ISNA.

Паводле яго даных, пасланне было перададзена ў панядзелак праз пасольства Швейцарыі.

У ноч на 14 верасня прадпрыемствы Saudi Aramco на ўсходзе краіны былі атакаваныя дзесяццю беспілотнымі лятальнымі апаратамі. Адказнасць за гэта ўзялі на сябе еменскія мяцежнікі-хусіты з руху «Ансар Алах». У прыватнасці, напад зазнаў найбуйнейшы ў свеце нафтаперапрацоўчы комплекс паблізу горада Абкаік, дзе пражывае шмат заходніх спецыялістаў, а таксама НПЗ у раёне Хурайс, у якім размяшчаецца другое па велічыні нафтавае радовішча каралеўства.

Пасля нападаў на іх успыхнуў моцны пажар. Пазней улады заявілі, што агонь быў лакалізаваны.

Дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа абвінаваціў Тэгеран у тым, што ён мае дачыненне да нападаў на нафтавыя аб'екты Саудаўскай Аравіі.

## Расійскі анколаг папярэдзіў пра скачок смяротнасці ад раку ў найбліжэйшыя гады

Смяротнасць ад анкалогіі ў Расіі можа павялічыцца на 20-30 % праз два гады, калі ў краіне не зменяцца правілы закупкі лекаў. Пра гэта ў інтэрв'ю газеце «Известия» заявіў дырэктар Інстытута гематалогіі, імуналогіі і клетачных тэхналогій Нацыянальнага медыцынскага даследчага цэнтра дзіцячай гематалогіі, анкалогіі і імуналогіі імя Дзмітрыя Рагачова Аляксей Масчан.

«Адбылася катастрофа, пра якую мы папярэджвалі некалькі гадоў таму, калі распрацоўваўся цэлы пакет законаў і падзаконных актаў па лекавым забеспячэнні. У выніку яго прыняцця пачалі знікаць лекі, якія штодня неабходныя для лячэння нашых пацыентаў», — сказаў Масчан.

Паводле яго слоў, з расійскага рынку знікаюць замежныя прэпараты, аналагаў якіх у Расіі не вырабляюць. Прафесар адзначыў, што гэта датычыцца, у прыватнасці, прэпаратаў для хіміятэрапіі — яны альбо знікаюць наогул, альбо з'яўляюцца «абсалютна не праверанымі ў клінічных даследаваннях генерыкамі».

Экаадукацыя

# ТРЫ ТЫСЯЧЫ ЭКАТОРБАЎ ЗА СЕМ ГАДЗІН

## Гранты на экалагічнае навучанне за фота са шматразовай сумкай

**Іх прапануюць дзесяці беларусам прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» і рух «Мэта-99» у рамках кампаніі «Пакед, пакет». За тры месяцы ў цэнтры «Экастарт» студэнтаў навучаць, як прыбраць са свайго жыцця лішкі пластыку і шкодных адходаў.**




Для большасці навучэнцаў вучоба платная. Каб стаць свядомым у трэндавым кірунку eco-friendly спосабу жыцця і атрымаць магчымасць займацца бясплатна, неабходна да 22 верасня запоўніць анкету і апублікаваць у Instagram здымак з любімай шматразовай сумкай для пакупак пад хэштэгам #покедпакет.

**Тым часам:**

Цяпер гандлёвыя аб'екты абавязаны мець у продажы пакеты, аднаразовы посуд і сталовыя прыборы з паперы. Гэта прадугледжана адпаведнай пастановай МАРГ і датычыцца крам з універсальным асартыментам тавараў, змешаным, спецыялізаваным і вузкаспецыялізаваным, а таксама кіёскаў, павільёнаў, аўтазаправак і іншых гандлёвых пунктаў.

У продажы павінна знаходзіцца ад аднаго да чатырох найменняў папяровага тавару. Адначасова з гэтым мінімізавана колькасць найменняў пластыкавых пакетаў і посуду ў пераліках тавараў, якія вызначаны пастановай № 28.

Пры продажы ў неспецыялізаваных крамах з камбінаваным асартыментам харчовых і нехарчовых тавараў (трох ці больш груп) экалагічна бяспечная прадукцыя павінна ўключацца ў асартыментны пералік.

У ліпені арганізатары кампаніі «Пакед, пакет» правялі краўдфандынг, дзе прапанавалі набыць экаторбу па цане пластыкавага пакета. Лот коштам адзін рубель складаўся з пяці шопераў розных фарматаў і памераў: ад мініяцюрнага клатча да торбы, у якую змесціцца 10-кілаграмовы кавун. За сем гадзін прадалі больш за тры тысячы сумак. Сабраныя грошы і пойдуць на гранты для дзесяці матываваных на экаадукацыю беларусаў.

— У школе мы ўсе вывучалі базавыя прадметы. Аднак мала хто выкарыстоўвае, напрыклад, матэматычныя веды, каб падлічыць, колькі лішняга пластыку ён выкарыстоўвае. Або ўзяць веданне моў — каб замяніць чарговы пакет прыстойным шматразовым «сінонімам»: авоська, шопер, заплечнік, — кажа **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Мы рады дапамагчы ініцыятыўным маладым людзям атрымаць экалагічную адукацыю бясплатна за кошт грантаў ад краўдфандынг-акцыі, якая атрымала такі водгук сярод беларусаў.

Падчас навучання студэнтам прапануюць інфармацыйныя экскурсіі, жывыя інтэрактыўныя сустрэчы, размовы з экспертамі, анлайн-платформу для навучання і доступ да калекцыі матэрыялаў па ахове навакольнага асяроддзя. Любое ўласнае экалагічнае мерапрыемства ад навучэнцаў вітаецца і падтрымліваецца.

**Ірына СІДАРОК.**

# АРХІЎНАЯ РЭСТАЎРАЦЫЯ І «ЭЛЕКТРОННЫ ЎРАД»

**Гэтыя і іншыя пытанні змогуць афіцыйна і дакументальна абмяркоўваць Беларусь і Аман пасля падпісання 18 верасня Мемарандума аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам юстыцыі Беларусі і Нацыянальным упраўленнем архіваў і дакументацыі Султаната Аман у галінах гістарычнай дакументацыі і кіравання дакументацыяй і архівамі.**

Мемарандум мае мэтай развіццё двухбаковых стасункаў па архіўнай справе і справаводстве і прадугледжвае абмен копіямі дакументаў па гісторыі Беларусі і Амана, а таксама забеспячэнне цэласнасці дакументальнай спадчыны краін.

Мяркуецца, што ведамствы змогуць сумесна вырашаць пытанні ўкаранення сучасных тэхналогій, у тым ліку такіх як рэстаўрацыя архіўных дакументаў, развіццё інфраструктуры «электроннага ўрада» і электроннага дакументаабароту.

Ініцыятарам падпісання дакумента стаў Дэпартамент па архівах і справаводстве Мінюста. Мемарандум разглядаюць як першую прыступку для ўстанаўлення больш глыбокіх кантактаў паміж архіўнымі ведамствамі краін.

**Ірына СІДАРОК.**

Белая вежа — 2019

# ЗВЫЧАЙНЫЯ СЛОВЫ ПРА ВАЙНУ І ЖЫЦЦЁ

## На тэатральным тыдні ў Брэсце вызначыліся калектывы з Расіі, Венгрыі, Арменіі, іншых краін

**Гэтым разам фестываль «Белая вежа» не тое што згубіўся, але атрымаўся нібы крышачку ў цяні грандыёзных святкаванняў тысячагоддзя. І выступленне на галоўнай плошчы горада даўняга сябра і ўлюбёнца тутэйшай публікі Львоўскага тэатра «Уваскрэсенне» многія ўспрымалі як мерапрыемства юбілейнай праграмы.**


Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.
Фрагменты выступлення тэатра «Уваскрэсенне».

У рэшце рэшт так яно і сталася. Гэта быў нават не спектакль, а яркае вогненнае шоу пад назвай «Карпацкі калейдаскоп». Пад каларытную музыку артысты на хадулях паказалі прыгожую дзею на матыў старадаўніх легендаў букаўчан, гуцулаў і бойкаў. Сюжэт замяніла чароўная магія агню, ад якога навокал станавілася горача і прыгожа. Гэты калектыў умее падпарадкаваць сабе гледача сваім мастацтвам. Яшчэ ў 2007 годзе вулічным спектаклем «Вішнёвы сад» яны ўзялі Гран-пры на «Вежы» пры аднадушным меркаванні як прафесійнага, так і глядацкага журы.

Сёлета львоўскія сябры фестывалю вясёлай вогненнай феерыяй павіншавалі брастаўчан з днём нараджэння горада, а мастацкі кіраўнік і дырэктар тэатра Яраслаў Федарышын паабяцаў налета прывезці да нас новы спектакль з маштабнымі дэкарацыямі і вялікім балетам, прысвечаны французскаму танцору Сержу Ліфару. Год пройдзе хутка.

Рэжысёр Федарышын быў яшчэ раз заяўлены ў афішы фестывалю, і зноў з яго любімым Чэхавым. Праўда, пастаноўка «Дзядзькі Вані» ажыццёўлена як сумесны праект двух венгерскіх тэатраў — Дануб Бенд Тэатра і Камернага Тэатра Бартак. Артысты з горада Вац уразілі сваёй не проста віртуознай ігрой, але амаль фантастычнай пластыкай, уменнем ужывацца ў вобраз героя. Гарманічна тут выглядала ўсё: ігра, дэкарацыі, эстэтыка. Крытыкі, словам, былі ў захапленні. А гледачы ў зале смяяліся, плакалі, прымяралі думкі персанажаў на сябе. Бо на сцэне ішла дзея пра немагчымасць быць шчаслівым, пра пошук кахання і шчасця ў свеце, які ходзіць па краёчку бездані. Нехта з крытыкаў потым назваў работу паклонам рэжысёра вялікаму мастацтву. Так яно, пэўна, і ёсць. І нікога не здзівіла, калі па выніках фэсту экспертны савет найлепшым спектаклем назваў менавіта «Дзядзьку Ваню».

Падзеяй сёлетняй «Вежы», несумненна, стаў монаспектакль армянскай актрысы Нарынэ Грыгаран «Мая сям'я ў маім чамадане». Гэта не толькі спектакль, гэта аповед відавочцы, удзельніка тых страшных падзей. Пра вайну ў Нагорным Карабаху мы ведаем у асноўным са скупых выпускаў навін. Тады, на пачатку 1990-х, нам яна здавалася нечым далёкім, не надта зразумелым. Праўда, здаралася пачуць ад знаёмых ці сваякоў знаёмых, што нехта прыехаў, збег ад вайны, ад пераследу. Іх расповеды адрозніваліся ад сухіх тэлевізійных паведамленняў. А тут проста шок... Нарынэ, якой у 1992 годзе было 12 гадоў, расказвае пра ўбачанае, пачутае, перажытае. Яе бацькі чакалі трэцяе дзіця, выехалі з горада ў карабахскае сяло ў спадзяванні знайсці спакой і паратунак. І аказаліся на самай лініі фронту. Бацька Нарынэ, які працаваў на будоўлі, трапіў у турму і штодня падвяргаўся жорсткім катаванням. Вачамі дзяўчынкі, яе дзіцячай душой мы спасцігаем, як можна выжыць у падвале, калі абстрэл доўжыцца некалькі гадзін запар, як адказваць на ўроку ў школе, калі пальцы замярзаюць і баляць ад холаду.

І гэта не самае страшнае, самае жахлівае наступае, калі сям'я аказваецца на парозе выбару... З'явілася магчымасць вывезці аднаго з сям'і ў Арменію, выратаваць аднаго з пяці чалавек. І сям'я вырашае, што гэта павінна быць Нарынэ. Сюжэтная лінія спектакля будуецца на ўспамінах дзяўчынкі з чамаданам, якая чакае выратавальнага верталёта.

Гледзячы на жанчыну, што перажыла ўсё гэта дзіцем, вымушана пакутуеш, хварэеш думкамі: ну як людзі могуць быць такімі наогул, чаму яны развязваюць падобныя войны і ператвараюцца ў нелюдзяў? Чаму тыя, што гадамі, дзесяцігоддзямі, вякамі жылі па-суседску, за нейкі лапік зямлі пачынаюць нішчыць адзін аднаго, адны становяцца забойцамі другіх па нацыянальнай прыкмеце? І пакуль мы разам з дзеячамі мастацтва пакутліва разважаем, войны ў розных канцах свету працягваюцца.

Сваю інтэрпрэтацыю падобнай тэмы прапанаваў Цюменскі вялікі драматычны тэатр. Яны прывезлі спектакль «Ганна Франк». Гэта рэальны чалавек. Аб гісторыі даведаліся ва ўсім свеце пасля публікацыі дзённікаў 15-гадовай ахвяры Халакосту. Дзяўчынка разам з сям'ёй два гады хавалася ў цесным пакоі паддашка аднаго з дамоў Амстэрдама, пакуль іх не знайшлі і не забілі нацысты. Фільм італьянца Раберта Беніні «Жыццё цудоўнае» па матывах дзённікаў Ганны атрымаў «Оскара». А вось цюменцы прапанавалі сваё бачанне п'есы Асі Валошынай пра юную Ганну. І артыстам удалося, несумненна, зачапіць гледача літаральна з першых секундаў, калі на сцэну выбегла мілавідная кучаравая дзяўчынка і адрэкамендавалася пісьменніцай, якой 27 гадоў. А праз секунду прызналася, што насамрэч яе няма, бо яна яўрэйка, а нейкія людзі вырашылі, што яе не павінна быць... А ў цэлым жа спектакль пра жыццё, якое бывае вясёлае, сумнае, забаўнае, трагічнае. Але гэта жыццё кожнага, і хто мае права пазбаўляць чалавека яго проста так? Вядома, тэма не новая, але ж вартая, каб яе завастраць зноў і зноў.

Так склалася, што гледачы «Белай вежы» заўсёды трапятліва чакаюць прыезду маскоўскіх і піцерскіх тэатраў. Большасць з іх становіцца падзеяй фэсту, хоць здараліся і расчараванні. Але гэтым разам студэнцкі спектакль «Школа. Метро. Сны» тэатральнай школы Канстанціна Райкіна прайшоў з аншлагам. Сваіх студэнтаў Канстанцін Аркадзевіч прадставіў сам, расказаў, якая жорсткая дысцыпліна ў іх навучальнай установе. Заняткі праходзяць з 9.30 да 22.10 з двума перапынкамі па 45 хвілін. Сапраўды, рэжым дня можна параўнаць хіба з сярэднявечным езуіцкім калегіумам... Студэнты хранічна не высыпаюцца, дасыпаць даводзіцца ў метро па дарозе ў інстытут. Адсюль і назва. Але ж нездарма педагогі так муштруюць навучэнцаў. Нечаму ўсё ж навучылі, калі пасля спектакля іх доўга не адпускалі са сцэны гледачы. Сам жа народны артыст Расіі выступіў яшчэ з монаспектаклем «Звычайныя словы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Беларусь і свет

# СВЯТА СЯБРОЎ — НАША СВЯТА



Вечар, прысвечаны 70-годдзю ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі, адбыўся ў мінскім Доме дружбы. Сюды былі запрошаны афіцыйныя асобы, прадстаўнікі таварыства дружбы «Беларусь-Кітай», актывісты Беларускага таварыства дружбы, студэнты мінскіх ВНУ. У зале, упрыгожанай дзяржаўнымі сцягамі Беларусі і Кітая, гасцей чакала вялікая фотавыстаўка, якая расказвала пра гістарычны шлях дзяржаваў і яе дасягненні.

Перад прысутнымі выступілі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цімін, намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй Дапкюнас, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Валерый Варанецкі.

Калі на вялікім экране з'явіліся маляўнічыя пейзажы Кітая, у зале пачалася музычная частка вечара — выступленні маладых майстроў мастацтва. Лаўрэаты міжнародных конкурсаў, магістранты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Ван Лэй і Юань Мэн выканалі кітайскія і беларускія песні. Салісты Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Наталля Дзяменцьева і Арцём Хамячонак таксама падарылі прысутным свае музычныя нумары.

Член таварыства «Беларусь-Кітай» паэт, перакладчык Мікалай Мятліцкі прачытаў свой верш, прысвечаны творцам Кітайскай Народнай Рэспублікі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**



Варта ўбачыць

# Музей грошай прымае наведвальнікаў

### Першымі стануць найбольш актыўныя школьнікі

**Сёлета 19 кастрычніка споўніцца 25 гадоў з моманту замацавання беларускага рубля ў якасці адзінага законнага плацежнага сродку нашай краіны. У гэты дзень у Нацыянальным банку адбудзецца ўрачыстае адкрыццё абноўленай экспазіцыі Музея грошай, прысвечанай гісторыі грашовага абарачэння і работы банкаўскіх устаноў на тэрыторыі Беларусі.**

Мяркуецца, што першымі наведвальнікамі Музея грошай стануць навучэнцы адной з устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Для іх будзе праведзена эксклюзіўная экскурсія з удзелам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Паўла Калаура. Таксама ўдзельнікаў мерапрыемства чакаюць сюрпрызы і падарункі.

Каб атрымаць шанц стаць першымі наведвальнікамі абноўленага Музея грошай, навучэнцам неабходна падрыхтаваць і да 1 кастрычніка накіраваць у Нацыянальны банк калектыўнае (ад свайго класа) віншаванне з 25-гадовым юбілеем беларускага рубля (або спасылку на яго) на электронны адрас museum@nbrb.by. У лісце трэба ўказаць населены пункт, школу, клас, кантактныя звесткі класнага кіраўніка.

Аўтары найлепшага віншавання будуць запрошаны менавіта 19 кастрычніка. Усе астатнія класы, якія даслалі свае віншаванні, атрымаюць магчымасць трапіць на экскурсію ў Музей грошай Нацыянальнага банка ў прыярытэтным парадку. Адважвайцеся!

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

19 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15871)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# «Паркур — толькі вуліца, толькі асфальт!»

Фота Юрыя КАСТАРОВА.


Віка Міхайлава.

**— Для заняткаў паркурам падыдзе любое месца. Бывае, прагульваемся па вуліцы і заўважаем круты завулак. Тады спыняемся і пачынаем трэніроўку, — кажа адна з маіх суразмоўніц Караліна АРУЦЮНЯН, дваццацідвухгадовы майстар спорту і трэнер па спартыўнай гімнастыцы. Разам з сяброўкай і калегай Вікторыяй МІХАЙЛАВАЙ, таксама майстрам спорту, яны ўжо два гады з'яўляюцца адзінымі дзяўчатамі-паркуршчыцамі ў Беларусі. Гэты кірунак спорту ўвайшоў у жыццё былых студэнтак дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры выпадкова. Аднойчы кампанія знаёмых прапанавала дзяўчатам паглядзець, чым яны займаюцца. І панеслася...**

— Калі хлопцы толькі пачыналі займацца паркурам, не было столькі інфармацыі, колькі цяпер, таму вучыліся самастойна, без падтрымкі трэнераў. Здымалі свае трэніроўкі на камеру, аналізавалі і выпраўлялі памылкі інтуітыўна, — кажа Караліна. — Першыя трэніроўкі мы праводзілі ў экстрым-парку на сталічнай вуліцы Сталетава. З Каралінай назіралі за хлопцамі, запаміналі базу, а пасля самі спрабавалі выконваць розныя трукі і звязкі. Нам спадабалася, што была маральная і фізічная падтрымка з боку хлопцаў, часта чулі ад іх падбадзёрванне. Дарэчы, адзін з тых трэйсераў (паркуршчыкаў. — **Аўт.**) — мой малады чалавек, — усміхаецца Вікторыя.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Свая справа

# АД АБ'ЯЎ — ДА ДВУХ УЛАСНЫХ ПРАЕКТАЎ,

## ці Дамагчыся поспеху ў 21 год

**— У трынаццаць гадоў я глядзела на равеснікаў і хацела быць, як яны: насіць прыгожае адзенне, мець дарагі тэлефон. На жаль, бацькі не маглі сабе гэта дазволіць, таму я ўладкавалася расклейшчыкам аб'яў, — расказвае Каміла ЖЫБУЛЯ.**



...Было цяжка: у дзень трэба было абысці 300—600 пад'ездаў, пры гэтым наведваць школу! Затое праз год яна змагла зарабіць на ноўтбук і тэлефон.

Далей у інтэрнэце дзяўчына пачала шукаць больш выгадныя вакансіі. Так увагу Камілы прыцягнула работа капірайтара. З кожным сімвалам, сказам, матэрыялам яна пашырала свае магчымасці і навыкі, што дапамагло затым уладкавацца ў больш перспектыўныя агенцтвы. Яна стала пазаштатным капірайтарам кампаніі «Kakadu Development», затым паспрабавала сябе ў якасці адміністратара групы «УКантакце» студыі «20\13». Працавала і пазаштатным карэспандэнтам у газеце «Переходный возраст», на партале «Камп'ютарныя весці», у праекце «Спарта» ў Мінску, SMM-спецыялістам у двух мінскіх рэстаранах...

Каміла не пераставала развівацца ў розных кірунках: сама асвойвала свет маркетынгу, прайшла SMM-курсы, хадзіла на майстар-класы і трэнінгі.

— Потым год працавала ў SMM-агенцтве па прынцыпе «стартапа», калі адзін чалавек робіць усё і адразу, — прызнае яна. — Трэба было тэлефанаваць, сустракацца з кліентамі, пісаць на сайт... пятае, дзясятае. За той год я сапраўды «перагарэла» нягледзячы на тое, што работа мне падабалася. Стамілася: шасцідзённы рабочы дзень, часам па дзесяць гадзін, напружваў. Спрабавала сысці на іншае месца, дзе больш грошай і менш абавязкаў — пратрымалася там паўтара месяца і зразумела, што не магу так больш. Вярнулася да фрылансу. А пасля з'явілася магчымасць зрабіць штосьці сваё.

Яшчэ падчас працы ў агенцтве да Камілы ў «Інстаграме» прыйшло нямала падпісчыкаў. Там яна давала парады па маркетынгу, продажам, тайм-менеджменце, самаразвіцці. Сур'ёзна за старонку ўзялася пасля сыходу з офіса: купляла рэкламу ў іншых вядомых блогераў, наладзіла сваю для капірайтараў, студэнтаў, SMMшчыкаў-пачаткоўцаў. Там жа дзяўчына пачала расказваць пра сваё жыццё, каб разбавіць сур'ёзнае. Блог паступова набіраў папулярнасць.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

Неўсвядомленая небяспека

# ГУЛЬНЯ... ЗАПОЕМ

## Як віртуальная рэчаіснасць разбурае псіхіку гульняманаў

**«Я з братам і невялікай купкай людзей знаходжуся ў ангары, ён адчынены. Вакол куча зброі. Потым на нас хтосьці напаў — унутр уварвалася група невядомых. Тут жа ўзяў аўтамат і... я чуў голас брата і мне было страшна, што ён можа памерці, але калі вырашыў дапамагчы яму, усё раптам спынілася. Усе былі мёртвыя. Я не стаў шукаць брата. Можа, проста не хацеў знайсці яго мёртвым, таму і не аглядаў трупы?» — так распавядае пра свой сон, сюжэт якога вельмі нагадвае камп'ютарныя гульні жанру «экшн», 21-гадовы геймер. «У сваім пакоі я размаўляў з незнаёмымі людзьмі. Раптам усе яны зніклі, а замест іх з'явілася знаёмая дзяўчына. Дзіўным голасам яна прамаўляла нейкія даты. Затым памяшканне афарбавалася ў яркія кіслотныя тоны і стала падобным на лабірынт, складзены са знаёмых рэчаў. З пачуццём страху я спрабаваў знайсці выхад да моманту абуджэння. Прачнуўся з трывогай, не мог зразумець, дзе знаходжуся». Адчуванне тугі і безвыходнасці пранізвае ўсе сны маладога чалавека, які шмат гадоў захапляецца камп'ютарнымі гульнямі. У іншым яго сне разгортваўся такі сюжэт: «Перад дзвярыма ў кватэру сядзела дзіўная істота, падобная на жабу. У жаху я ўцёк на вуліцу, дзе было цёмна настолькі, што наогул нічога нельга было разгледзець. Блукаў у цемры да абуджэння».**



***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

# ГУЛЬНЯ... ЗАПОЕМ

## ТРЫВОЖНЫЯ СІГНАЛЫ

Ці прысутнічае ў вас вобраз віртуальнага свету пасля заканчэння гульні або выхаду з сеціва? Ці бывае адчуванне, што ён кіруе вамі? На працягу якога часу бачыце ці адчуваеце гэты вобраз? Ці з'яўляецца ў вас неадчэпнае жаданне паўтарыць у жыцці тое, што рабілі ў працэсе гульні? Калі ў ёй прысутнічаюць патокі крыві, расчляనёныя целы, масавыя забойствы, маляўнічыя сцэны гвалту, што адчуваеце: задавальненне, агіду, узбуджэнне (у тым ліку сексуальнае), абыякавасць, прыліў адрэналіну? Ці прыцягвае вас магчымасць самаліквідацыі? Вам даводзілася прасынацца ад страху і трывогі?

Гэтыя і многія іншыя пытанні ўтрымлівае анкета, якая вызначае характар уплыву камп'ютарных гульняў на эмацыянальны і псіхалагічны стан, а таксама на стыль мыслення геймераў. Яе распрацавалі **кандыдат тэхнічных навук, загадчык кафедры інжынернай псіхалогіі і эрганомікі БДУІР Канстанцін ЯШЫН, урач-псіхіятр Кіра МЕЗЯНАЯ і Канстанцін КАРАНЕЎСКІ, урач-неўролаг 22-й мінскай гарадской дзіцячай паліклінікі.** Нядаўна яны запатэнтавалі свой спосаб выяўлення прыкмет расстройстваў у чалавека, якія ўзнікаюць пад уплывам празмернага захаплення камп'ютарнымі гульнямі з сюжэтамі гвалту.

**Самаліквідацыя аказвае істотны ўплыў на псіхалогію карыстальнікаў.**

— За апошнія гады даследчыя групы ў РНПЦ псіхічнага здароўя, на кафедры інжынернай псіхалогіі і эрганомікі БДУІР, кафедры гігіены дзяцей і падлеткаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта абследавалі некалькіх тысяч падлеткаў і студэнтаў у сталічных школах і ВНУ. Вынікі сведчаць, што сярод іх ужо сфарміравалася група асоб з камп'ютарнай залежнасцю. І нават калі гэта ўсяго адзін працэнт ад колькасці абследаваных, то ў пераліку на колькасць дзіцячага насельніцтва атрымліваецца, што ахвярамі камп'ютарнай залежнасці сталі каля дзвюх тысяч дзяцей толькі ў Мінску, — тлумачыць маштаб праблемы **урач-псіхіятр з саракагадовым вопытам работы Кіра МЕЗЯНАЯ.** — У той жа час устаноўлена высокая рызыка фарміравання залежнасці сярод абследаваных дзяцей — на ўзроўні 30 працэнтаў. Сярод моладзі ва ўзросце 18 гадоў і старэйшай камп'ютарная залежнасць устаноўлена на ўзроўні 20 працэнтаў. Такім чынам, неабходнасць аказання дапамогі асобам з ёй ужо відавочная.

Між іншым, Сусветная арганізацыі аховы здароўя ўключыла залежнасць ад відэагульняў у 11-е выданне Міжнароднай класіфікацыі хвароб. У дакуменце сказана, што гульнявое расстройства з'яўляецца пэўнай мадэллю паводзінаў. Чалавек лічыцца захварэлым, калі гульні пачынаюць так ці інакш негатыўна ўплываць на яго жыццё, становяцца наперадзе ўсіх іншых жыццёвых інтарэсаў, а таксама выклікаюць парушэнні ў сямейнай, сацыяльнай, адукацыйнай, прафесійнай ці іншых сферах жыцця.

Яшчэ адным важным аспектам лічыцца парушэнне кантролю над гульнявым часам, а таксама прыярытэтнасць гульняў нават пасля таго, як узнікаюць негатыўныя наступствы. Для пастаноўкі дыягназу сімптомы павінны захоўвацца на працягу года, але ён можа быць пастаўлены і раней, у залежнасці ад ступені іх выражанасці. Дакумент уступіць у сілу з 1 студзеня 2022 года.

## ВАКОЛ АДНЫ ВОРАГІ?

— Уявіце сабе падлетка ці маладога чалавека, які па пяцьшэсць гадзін штодня праводзіць за гульнёй у «стралялку», — працягвае Кіра Мезяная. — У Вялікабрытаніі летась быў выпадак, калі дзесяцігадовы хлопчык на працягу васьмі гадзін не мог адцягнуць увагу ад камп'ютарнай гульні, каб сходзіць у прыбіральню, і ў выніку апынуўся ў бальніцы. У юнага геймера моцна пашырыўся кішэчнік, а мачавы пузыр перастаў функцыянаваць і надзьмуўся да такіх памераў, што тырчаў з жывата. Доктар прызналася: падумала, што ў хлопчыка агрэсіўная ракавая пухліна. Медыкам давялося лячыць дзіця слабіцельнымі і праводзіць уралагічныя працэдуры. Таксама з ім актыўна працавалі псіхолагі.



**Геймеры пачынаюць дзейнічаць па алгарытме героя гульні, той імі «кіруе» ў іх галаве.**

«Свет шматлікіх камп'ютарных гульняў жорсткі і бязлітасны. Геймер вядзе ў ім барацьбу, кіруючы героем гульні. Ён знішчае віртуальных ворагаў, а тыя спрабуюць ліквідаваць яго. Хоць падчас гульні геймер атаясамлівае сябе з яе героем, які дзейнічае як робат, сам ён адчувае ўласцівы чалавеку страх перад агіднымі і зласлівымі істотамі. Працяглы стрэс, выкліканы моцнымі эмацыянальнымі перажываннямі, аказвае дэструктыўнае ўздзеянне на чалавека і прынцыпы барацьбы ў віртуальным свеце пераносяцца ў рэчаіснасць, — папярэджвае ўрач-псіхіятр. — Геймер адчувае сваю неабароненасць, яму здаецца, што ўсе глядзяць на яго коса, навакольны свет уяўляе сабой пагрозу —- як у гульні. Такое стаўленне спараджае спачатку высокі ўзровень трывожнасці асобы, а затым і фарміраванне паранойі».

А вось яшчэ адно прызнанне геймера: «Мне было 12 гадоў, і я думаў, што ўжо нішто не можа напалохаць пасля камп'ютарных гульняў у жанры «хорар», але я памыляўся. У снах усё было інакш. «Я стаяў перад дзвярыма і глядзеў у вочка на вялізнага павука. Той раптам стаў біцца ў дзверы. Я зачыніў другія дзверы, забег у пакой і стаў на падаконнік. Стаяў перад адчыненым акном, калі павук разбіў другія дзверы, і ў той момант, калі ён гатовы быў скокнуць на мяне, ступіў у акно. Запомніў адчуванне свабоднага падзення і тое, як зямля набліжаецца. Потым я прачнуўся».

— Абуджэнне ад страху і трывогі з'яўляецца следствам дэструктыўнага ўплыву сюжэтаў віртуальнага свету і фарміраванне паталагічных станаў псіхікі, у прыватнасці — дэпрэсіі, — тлумачыць Кіра Мезяная. — Падчас анкетавання, якое мы з калегамі праводзілі ў дзвюх тэхнічных ВНУ, высветлілася, што асаблівай папулярнасцю карыстаюцца ў студэнтаў гульні-стратэгіі — ім аддаюць перавагу 64 працэнты рэспандэнтаў і гульні ў рэжыме анлайн (54 працэнты). Вынікі аналізу паказалі, што ў 40 працэнтах выпадкаў студэнты імкнуцца да праявы ў гульні заступніцтва, выратавання і абароны персанажаў. Аднак трацІна з іх для дасягнення добрай мэты прыбягаюць да гвалту і знішчэння ў гульнявым свеце, канстатуючы, што гэта дастаўляе ім задавальненне і «шмат адрэналіну». Агрэсія і гвалт у гульнях сталі настолькі звыклымі і штодзённымі, што больш за 20 працэнтаў рэспандэнтаў, выконваючы такія дзеянні, адчуваюць абыякавасць.

У некаторых геймераў пасля выхаду з гульні з'яўляецца так званы аўтаномны віртуальны вобраз, калі пры выключаным камп'ютары ў пакоі з'яўляецца герой гульні ці графіка, чуюцца галасы... Гэты псіхічны феномен захоўваецца ад некалькіх хвілін да некалькіх дзён. Геймеры пачынаюць дзейнічаць па алгарытме героя гульні, той імі «кіруе» ў іх галаве. Вобраз з гульні «сядзіць, ходзіць, размаўляе».

**Студэнты прызналіся, што пасля выхаду з гульні адчуваюць у руцэ зброю.**

Сярод асоб з такім расстройствам большасць аддае перавагу ролевым гульням з прымяненнем гвалту, а некаторыя з іх адчуваюць пры гэтым задавальненне і сексуальнае ўзбуджэнне. Акрамя таго, такія студэнты прызналіся, што пасля выхаду з гульні адчуваюць у руцэ зброю, якой іх герой дзейнічаў у віртуальных бітвах. У 14 студэнтаў (9,3 працэнта ад ліку абследаваных) «з'явілася навязлівае жаданне здзейсніць у жыцці тое, што рабіў у працэсе гульні». Гэта дазваляе меркаваць, што агрэсіўныя жанры гульняў з'яўляюцца адным з фактараў фарміравання псіхапаталагічных расстройстваў. Не выключана, што некаторыя з іх аматараў раней ці пазней трапляюць у крымінальную хроніку ці ў хроніку трагічных здарэнняў. На жаль, гэтыя псіхічныя парушэнні не выяўляюцца ў геймераў спецыялістамі своечасова.

## Я — УСЁМАГУТНАЯ СУТНАСЦЬ!

Па словах Кіры Мезянай, увагі заслугоўвае яшчэ адзін важны феномен ролевай камп'ютарнай гульні — самаліквідацыя: яна аказвае істотны ўплыў на псіхалогію карыстальнікаў. Гульцы разумеюць самаліквідацыю героя або персанажа як акт, які дазваляе ў гульні адмовіцца ад нездавальняючага выніку ў працэсе набірання ачкоў і ў тым выпадку, калі яго дзеянні акажуцца непаспяховымі. Гэты акт можа прынесці карысць камандзе або дазволіць герою (іграку) распачаць гульню нанова.

**«Геймер адчувае сваю неабароненасць, навакольны свет уяўляе сабой пагрозу — як у гульні».**

— Станоўчы адказ на пытанне «Ці прыцягвае вас магчымасць самаліквідацыі?» далі 15 працэнтаў рэспандэнтаў. Сярод іх з'яўленне аўтаномнага віртуальнага вобраза пасля гульні сустракаецца ў тры разы часцей, чым сярод асоб, якія адмаўляюць прыцягальнасць самаліквідацыі для сябе, — заўважае спецыяліст. — Гэта дазваляе зрабіць выснову: як прывабнасць самаліквідацыі ў гульні, так і з'яўленне аўтаномнага віртуальнага вобраза ствараюць высокую пагрозу для фарміравання разбуральных тэндэнцый у псіхічным здароўі. Намі даказана: самаліквідацыя выклікае трывожныя растройствы ў геймераў, і ў першую чаргу, парушэнні сну.

Таксама вынікі нашых даследаванняў дазваляюць зрабіць выснову аб наяўнасці сувязі паміж расстройствам сну і працяглым знаходжаннем у віртуальнай прасторы. Было ўстаноўлена, што гульнявыя сюжэты ў снах прысутнічаюць у 16 працэнтаў рэспандэнтаў. Асаблівыя перажыванні з'явіліся ў 21 чалавека (14,8 працэнта) — яны паведамілі пра «дзіўнае адчуванне будучых змен, прадчуванне сваёй абранасці, нейкага прызначэння». Вывучэнне сюжэтаў сноў паказала, што некаторыя геймеры атаясамліваюць сябе ў іх з магутнымі сіламі і персанажамі гульняў. Так, напрыклад, адзін бачыў сябе ў вобразе біблейскага Понцыя Пілата, іншыя — у вобразе наёмнага забойцы або «ўсёмагутнай сутнасці». Студэнты з такімі перажываннямі гуляюць у жанры стратэгій больш за шэсць гадзін у суткі або «запоем» — да 168 гадзін у тыдзень. І тут паўстае ўжо іншае пытанне: ці ў стане нейракагнітыўная сфера чалавека захоўваць адэкватнае адлюстраванне знешняга свету ў працэсе рэгулярнага шматгадзіннага знаходжання ў гульні пры прыгнечанні ўсіх сігналаў з рэальнага свету?

## КАНФЛІКТ ІНТАРЭСАЎ

Да канца бягучага года ў англійскім выдавецтве выйдзе кніга «Віртуальны свет: стваральнікі, жыхары, турысты», якую напісалі Кіра Мезяная, Канстанцін Яшын і Канстанцін Каранеўскі. Яна ў папулярнай форме знаёміць чытачоў з камп'ютарным віртуальным светам, які стаў часткай сучаснай індустрыі забаў. У ёй прадстаўлены вынікі даследаванняў камп'ютарнай залежнасці, праведзеныя аўтарамі на працягу апошніх гадоў. Асобны раздзел прысвечаны скандынаўскай міфалогіі, сюжэты якой прысутнічаюць у камп'ютарных гульнях...

**Гульнявое расстройства з'яўляецца пэўнай мадэллю паводзінаў.**

— Я лічу вялікім пралікам, што да сённяшняга ў Беларусі адсутнічае цэнтр па вывучэнні праблемы камп'ютарнай залежнасці, і, у першую чаргу, геймерства, — падкрэслівае Кіра Мезяная. — Між іншым, пасля таго як стала вядома аб уключэнні яе ў новую Міжнародную класіфікацыю хвароб, шэраг буйных кампаній, якія маюць непасрэднае дачыненне да гульнявой індустрыі, заявілі, што дыягназ не заснаваны на досыць важкіх доказах, каб апраўдаць яго ўключэнне ў адзін з найбольш важных нарматворчых інструментаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Быццам бы навуковая аснова для ўключэння гульні ў спіс расстройстваў пакуль што слабая. У заяве, падпісанай арганізацыямі з Еўропы, ЗША, Канады, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Паўднёвай Карэі, Паўднёвай Афрыкі і Бразіліі ўтрымліваўся заклік да СААЗ «пераасэнсаваць» гэтае рашэнне. Агрэсіўная рэклама гульняў, а таксама сацыяльнае адабрэнне такога віду дзейнасці відавочна не спрые зніжэнню ўзроўню залежных. Дык няўжо для Беларусі гэтая праблема яшчэ недастаткова актуальная? Мяркую, што сёння мы ўсе бачым толькі вяршыню айсберга.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Экалогія сумлення*

# ТАБУ НА ПЛАСТЫК. МЫ — ЗА ШОПЕРЫ!



АМАЛЬ кожны чуў выраз: калі хочаце, каб штосьці змянілася, трэба пачынаць з сябе. Але адна справа разумець гэта, і зусім іншая — увасабляць у жыццё.

**Паліна Бурко, студэнтка чацвёртага курса кафедры міжкультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,** — адна з тых, каго можна назваць актывістам экалагічнага руху.

— Тое, з чаго пачала, — збіранне смецця асобна. Пасля ўдзельнічала ў розных праектах і экспедыцыях. Напрыклад, ездзіла ў Светлагорск наконт высвятлення экалагічнасці завода беленай цэлюлозы, нядаўна валанцёрыла ў Zero Waste Market. Гэта крама з серыі «нуль адходаў», дзе можна набыць фермерскія прадукты без пакетаў і пакаштаваць веганскую ежу. Таксама я добраахвотніца «Зялёнай сеткі». Менавіта дзякуючы такім мерапрыемствам з'яўляецца выдатная магчымасць распаўсюджваць інфармацыю пра экалогію, — кажа суразмоўніца.

**Юльяну Гарачкову, студэнтку трэцяга курса факультэта журналістыкі БДУ,** таксама хвалюе гэтая тэма. Яшчэ ў 10—11 класах яна пачала глядзець дакументальныя фільмы аб прыродзе. Таксама ёй пашчасціла з настаўніцай па геаграфіі, якая імкнулася расказаць як мага больш пра асушэнне балот і высечку лясоў. Тады Юльяне было проста жахліва ад пачутай інфармацыі, але пасля першага курса ўніверсітэта, калі з'явілася больш сур'ёзнасці ў думках, пачалося глыбокае разуменне пытанняў экалогіі.

— Я ўбачыла відэа, дзе ў чарапашкі дастаюць з носа трубачкі, — вось так і асэнсавала, што больш не хачу выкарыстоўваць пластык. Спрабавала мінімізаваць яго ў сваім жыцці, наколькі гэта магчыма. Ужо год як атрымліваецца. Для крамы ў мяне ёсць шопер, каб складваць пакупкі. Заўсёды з сабой кубак — у кавярнях ніколі не бяру пластыкавы посуд. Нават трубачку для напояў выкарыстоўваю металічную. Не купляю вопратку ў мас-маркетах з-за таго, што там велізарны перарасход рэсурсаў. Куды потым ідуць незапатрабаваныя рэчы? На жаль, тое, што не прадалося, не заўсёды нават утылізуецца. Часцей за ўсё гэта проста выкідваюць, выклікаючы тым працэсы гніення, што дрэнна ўплывае на навакольнае асяроддзе. Зараз я часты госць сэканд-хэндаў — атрымліваецца, што ты перавыкарыстоўваеш рэчы, а значыць, пакідаеш менш смецця. Да таго ж там ёсць брэндавая вопратка, — гаворыць Юльяна.

Дзяўчына кажа, што, калі пачынаеш выступаць за абмежаванне спажывання, людзі часам перастаюць цябе разумець, з іх боку нават прысутнічае ў нейкай ступені асуджэнне. Навошта хадзіць са сваім кубкам і трубачкай? Калегі з Юльяны з гэтай нагоды смяяліся і жартавалі. Праўда, да таго часу, пакуль дзяўчына не паведаміла ім глабальную сутнасць праблем экалогіі. Зараз яны самі імкнуцца выкарыстоўваць менш пластыку.

Дзяўчаты матывуюць сябе пашырэннем кола людзей, зацікаўленых у пытаннях навакольнага асяроддзя. Ім хочацца, каб пра іх задумаліся як мага больш суайчыннікаў. Аднак не заўсёды тыя, каму захацелася быць «экалагічна свядомым», ведаюць, з чаго пачынаць і куды ісці. Паліна рэкамендуе ўдзельнічаць у розных мерапрыемствах і сустрэчах па гэтай тэме:

— Яны заўсёды натхняюць, на іх можна даведацца, як зрабіць свой унёсак у падтрымку руху. Таксама раю паспрабаваць паваланцёрыць, напрыклад, як і я, у «Зялёнай сетцы».

Юльяна рэкамендуе знайсці блогераў і чытаць іх матэрыялы, а таксама навіны ад «Грынпіс».

Дзяўчаты ўпэўненыя, што галоўнае — захацець.

**Паліна БЕРТАШ, студэнтка III курса факультэт журналістыкі БДУ.**

*Ведай нашых!*

# Што мы ведаем аб Зямлі?

**«Золата» і «бронзу» заваявалі беларускія школьнікі на XIII Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб Зямлі (IESO 2019) у Паўднёвай Карэі.**



Залатой узнагародай у складзе міжнароднай каманды ў практычным туры ўганараваны дзевяцікласнік віцебскай гімназіі № 2 Дзмітрый Міхаська. А вучань 9 класа брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніс Рабчук стаў бронзавым прызёрам у індывідуальным заліку.

У склад нацыянальнай зборнай таксама ўвайшлі дзесяцікласнікі гродзенскай гарадской гімназіі Уладзіслаў Вайняловіч і гомельскай гімназіі № 10 Аляксандр Шпакоўскі.

Хлопцы выступалі пад кіраўніцтвам дэкана факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ Дзмітрыя Курловіча і дацэнта кафедры міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін ВНУ Людмілы Факеевай. Таксама падрыхтоўкай беларускіх школьнікаў займаліся супрацоўнікі Інстытута геалогіі Навукова-практычнага цэнтра па геалогіі.

Усяго ў алімпіядзе прыняло ўдзел больш за 160 школьнікаў з 43 краін свету. Навучэнцам прапаноўвалася вызначыць мінералы і горныя пароды, выявіць небяспечныя геолага-геамарфалагічныя працэсы, адказаць на пытанні, звязаныя са змяненнем клімату, берагавымі працэсамі, якасцю водных рэсурсаў і іншыя.

XIV Міжнародная алімпіяда па навуках аб Зямлі пройдзе ў 2020 годзе ў Расіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Паспяховасць «у лічбе»*

# Атрымайце электронную залікоўку

## Іх упершыню ўкарэняць у БДУ

**Каля пяці тысяч першакурснікаў і магістрантаў усіх формаў навучання стануць карыстальнікамі электронных залікоўак. Гэты пілотны праект дасць магчымасць стварыць шматфункцыянальны вэб-сэрвіс для вядучай ВНУ краіны і аптымізаваць атэстацыйны працэс, паведаміла прэс-служба БДУ.**

IT-інавацыя ўключае ўсе функцыі свайго папяровага прататыпа і значна спрашчае падрыхтоўку справаздачнай дакументацыі і аналіз паспяховасці. Акрамя таго, хлопцы і дзяўчаты, а таксама іх бацькі ў любы час на камп'ютары, планшэце ці смартфоне змогуць атрымаць доступ праз асабісты кабінет студэнта да прагляду экзаменацыйных адзнак за ўвесь перыяд навучання. Таксама яна вызваляе ад неабходнасці замены папяровага дакумента пры яго пашкоджанні або страце.

На пачатковым этапе ўкаранення электронных залікоўак выкарыстанне папяровых ведамасцяў захаваецца. У далейшым мяркуецца поўная аўтаматызацыя працэсу атэстацыі. Сродкам ідэнтыфікацыі студэнта на экзамене стане студэнцкі білет.

Укараненне электроннай залікоўкі дазволіць значна сэканоміць фінансавыя сродкі за кошт адмовы ад папяровай версіі і выкарыстання наяўных у БДУ сучасных лічбавых тэхналогій.

Распрацоўшчыкам навацыі выступіў Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ. Работа над праектам вялася ў рамках рэалізацыі комплексу мерапрыемстваў Стратэгіі лічбавай трансфармацыі БДУ, прынятай у 2018 годзе. Нагадаем, летась студэнты ВНУ сталі ўладальнікамі шматфункцыянальнага электроннага студэнцкага білета, сумешчанага з банкаўскай аплатнай карткай. Як вядома, у 2003 годзе БДУ стаў першай ВНУ Беларусі, якая ўвяла ў карыстанне электронныя студэнцкія білеты, а ў 2010 годзе яны былі ўкаранёны ва ўсе ўстановы вышэйшай адукацыі краіны. Дарэчы, толькі ў 2018 годзе за кошт выкарыстання новых студэнцкіх білетаў на аснове міжнародных банкаўскіх картак універсітэт сэканоміў каля 40 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Жывая гісторыя*

# «Каб жыццё паўтарылася зноўку,

## ЗАЗІРНІЦЕ Ў СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ...»

**У Беларусі стартуе другі конкурс маладзёжных гістарычных работ «За кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці». Ён скіраваны на вывучэнне жывой гісторыі краіны другой паловы XX стагоддзя праз даследаванне сямейных і лакальных фотаархіваў і ўспамінаў відавочцаў.**

Арганізатары прапануюць маладым людзям ва ўзросце ад 15 да 25 гадоў звярнуць увагу на малавывучаныя старонкі гісторыі Беларусі ў перыяд з 1945 да 2000 года. Сярод прапанаваных тэм — паўсядзённы побыт, маладзёжныя субкультуры, трансфармацыя гендарных роляў у сем'ях, нефармальныя маладзёжныя рухі і іншыя. Даследчая работа павінна быць заснавана на аналізе архіўных фатаграфій, а таксама вусных апавядаў відавочцаў падзей. Падрабязную інфармацыю аб конкурсе і ўмовах удзелу ў ім можна знайсці на сайце pazakadram.tilda.ws.

Конкурс праводзіцца прадстаўніцтвам зарэгістраванага аб'яднання Deutscher Volkshochschul-Verband e.V. (ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь у супрацоўніцтве з маладзёжным грамадскім аб'яднаннем «Гісторыка» пры падтрымцы міністэрства замежных спраў Германіі.

Пераможцы конкурсу будуць абвешчаныя пасля 1 чэрвеня 2020 года. Яны атрымаюць каштоўныя прызы і дыпломы. Найлепшыя работы прадстаўлены на спецыяльнай цырымоніі ўзнагароджання ў Мінску. А тыя з іх, якія маюць нестандартныя і крэатыўныя формы падачы матэрыялу, будуць паказаны ў рамках адкрытых публічных прэзентацый.

Акрамя таго, «найлепшыя з найлепшых» атрымаюць магчымасць удзелу ў міжнародным гістарычным лагеры, які пройдзе ў адной з еўрапейскіх краін з моцнай традыцыяй правядзення гістарычных конкурсаў восенню 2020 года. А куратары найлепшых работ змогуць прыняць удзел у «Міжнароднай летняй гістарычнай акадэміі» восенню 2020 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# Кідаць усё і — у Мінск!

**Ён увайшоў у спіс найлепшых студэнцкіх гарадоў планеты. Рэйтынг, які ўключае 120 пазіцый, прадставіў інтэрнэт-рэсурс TopUniversities.com. Беларуская сталіца замыкае гэты спіс.**

Сярод цэлага шэрагу крытэрыяў адбору — даступнасць і бяспека, наяўнасць у горадзе ВНУ з рэйтынга найлепшых універсітэтаў свету, актыўнасць работадаўцаў, меркаванне саміх студэнтаў.

Складальнікі рэйтынга адзначаюць, што Мінск можа многае прапанаваць. Выпускнікі яго ВНУ запатрабаваныя ў работадаўцаў. Акрамя таго, у горадзе ёсць чым заняцца пасля вучобы. Напрыклад, можна наведваць музеі, знаёміцца з архітэктурай і багатай гісторыяй беларускай сталіцы, пакаштаваць стравы айчыннай кухні.

З суседніх сталіц у спіс таксама патрапілі Масква, Кіеў і Вільнюс.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
19 09 2019 г.

Ідэі маладых

# У «Школу рэдактараў БДУ» да... студэнткі

**Гады вучобы — гэта час, калі ў многіх адкрываюцца новыя магчымасці і з'яўляецца вялікая колькасць цікавых ідэй. Вельмі важна ўхапіцца хоць бы за адну, але раскласці яе па «пясчынках», каб паглыбіцца ў тэму. Менавіта так і зрабіла наша гераіня. Яшчэ нядаўна студэнтка-другакурсніца падавала заяўкі на ўдзел у розных адукацыйных івентах, а зараз думае над другім сезонам уласнага праекта.**




Фота Аляксандры СТРАЙНОЎСКАЙ.

У канцы першага курса навучання на факультэце журналістыкі БДУ Настасся Ларына захацела зрабіць нешта сваё. Стаўшы ўдзельніцай некалькіх універсітэцкіх мерапрыемстваў («Публіка і я», «EVENT-лабараторыя»), яна ўважліва сачыла за тым, як усё арганізоўваецца, выяўляла вартасці і недахопы працэсу.

— На той момант я яшчэ не ведала, што буду ствараць. Аднойчы дадумалася — трэба зрабіць «Школу рэдактараў БДУ»! Гэта быў васьмітыднёвы праект для студэнтаў, які хочуць навучыцца працаваць з тэкстамі, прыдумваць тэмы, складаць рэзюмэ пад кіраўніцтвам вопытных настаўнікаў — журналістаў, спецыялістаў па камунікацыі, дызайнераў. Курс складаўся з лекцый і дамашніх заданняў. Мерапрыемства задумвалася для ўсіх, хто піша — для сябе або па рабоце, — прыгадвае суразмоўніца. — Звязалася са старшынёй Студэнцкага савета БДУ па якасці адукацыі Артурам Кандраценкам — разумела, што трэба рэалізоўваць задуму праз якую-небудзь студэнцкую арганізацыю. Калі разам усё абмеркавалі, аказалася, што, каб атрымаць фінансаванне, трэба паўдзельнічаць ва ўніверсітэцкім конкурсе «Найлепшы маладзёжны праект», што я і зрабіла. Апошні адобрылі — так і пачалася ўласна работа.

Калі ідэя і план ёсць, трэба прыступаць да канцэпцыі, у якой неабходна абазначыць мэту і задачы. Настасся параўноўвае гэта з даследчыцкай працай, адзінае адрозненне — тут патрэбна яшчэ і практычная рэалізацыя. Канешне, калі штосьці робіцца першы раз, асабліва важна адчуваць падтрымку. Настасся прыадкрывае сакрэты:

— Артур Кандраценка кансультаваў мяне па дакументах. Дызайн і якасныя фотаздымкі рабілі добрыя знаёмыя. Па агульнай арганізацыі з большасці спраўлялася сама, бо хацела даведацца, як усё працуе знутры, каб у наступныя сезоны зрабіць нейкі «гадзіннік», па якім кожны будзе сачыць, як і што трэба выконваць.

Яшчэ неабходна мець на ўвазе, што ў любы момант можа здарыцца ўсё, што заўгодна, а шукаць выйсце прыйдзецца менавіта арганізатару. Настасся Ларына прызнаецца, што ў «Школе рэдактараў БДУ» не абышлося без такіх сітуацый:

— Была неяк пазаштатная сітуацыя, калі спікер трапіла ў аварыю, а да пачатку яе лекцыі заставалася дзесяць хвілін. Яна папрасіла мужа даслаць прэзентацыю, каб у нас была інфармацыя. І старшыня Студэнцкага савета па якасці адукацыі на факультэце журналістыкі Ксенія Ганчарык спакойна правяла гэтую лекцыю.

Любы праект, нават студэнцкі, патрабуе фінансавага забеспячэння. Частку грошай, як мы ўжо даведаліся, дзяўчына атрымала дзякуючы конкурсу «Найлепшы маладзёжны праект». Але ці хапіла іх?

— Збольшага той сумы было дастаткова. Таксама спрабавалі атрымаць зніжку на налепкі, кубкі, нататнікі — напісалі 15 друкарскім цэнтрам, але адказ атрымалі толькі ад аднаго, затое станоўчы, — адказвае Настасся.

На першых этапах планавалася, што на мерапрыемства трапяць толькі 20 чалавек, але напрыканцы падачы заяў аказалася, што колькасць ахвотных — больш за 80. Прыйшлося адбіраць па некалькіх крытэрыях, якія пералічвае суразмоўніца:

— У анкеце было пытанне: «Навошта вам гэта?», з адказу на якое можна было зразумець матывацыю. Таксама прагладалі старонкі ў сацыяльных сетках. Мы не бралі тых, па чыім профілі разумелі, што ім насамрэч не вельмі цікавая тэматыка праекта «Школа рэдактараў БДУ». Хоць, напэўна, гэта было не вельмі справядліва. У выніку мы абралі 30 прэтэндэнтаў.

Калі ўкладваеш у справу шмат энергіі, то, канешне, хочацца аддачы, якая ў Настассі Ларынай і была, — ёй пакінулі шмат добрых водгукаў. Усе атрымалі сертыфікаты ўдзельніка, што ў будучыні, магчыма, дапаможа ім пры адборы на нейкую стажыроўку. Вясной плануецца распачаць другі сезон «Школы рэдактараў БДУ», дзе, мабыць, будзе яшчэ больш спікераў і ўдзельнікаў.

**Паліна БЕРТАШ, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# АД АБ'ЯЎ — ДА ДВУХ УЛАСНЫХ ПРАЕКТАЎ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Цяпер падпісчыкаў ужо каля 130 тысяч! Частка з іх ацэньвае пасты, піша каментарыі, выказвае ўдзячнасць за інфармацыю ў дырэкт (асабістыя паведамленні). Аднак у інтэрнэце хапае і тых, хто пакідае шмат негатыву. «Чым больш падпісчыкаў, — кажа Каміла, — тым больш агрэсіі. Мне пагражалі: сапсаваць рэпутацыю, знішчыць агенцтва... Звычайна пішуць пра знешнасць, называюць выскачкай — часцей за ўсё з пустых фэйкавых старонак. Таму звяртаць увагу на ўсё гэта не лічу патрэбным».

...У блогу напісана: «Гадую два бізнесы». Гэта SMM-агенцтва «Popcorn media» і інфабіз (курсы, вэбінары, марафоны).

— Спачатку з'явіліся курсы, — расказвае Каміла. — Чаму я вырашыла іх арганізаваць? Прасілі самі падпісчыкі. Гэта было штосьці накшталт рэпетытарства, адзін на адзін. Аднак, паспрабаваўшы на двух-трох суразмоўніках і зразумеўшы, што гэта не вельмі эфектыўна, запусціла праект анлайн-курсаў «Мама, я SMMшчык». З інфабізнесам проста: усё ўпіраецца ў адну пляцоўку. Робіш пэўную стартавую рэкламу, аплачваеш саму платформу для правядзення, купляеш вэб-камеру, мікрафон... Пры падрыхтоўцы да сваіх курсаў я прыгадвала, чаго не хапала менавіта мне. Наладзіла зваротную сувязь з падпісчыкамі. Што адрознівае мяне ад іншых? Я практык. У мяне на занятках кожны атрымлівае ўмоўнага кліента. Потым піша стратэгію, вучыцца ствараць брыфы, вывучае дызайн і фотаздымкі, наладжвае рэкламу, камунікуе з блогерамі...

Звычайна ў групу Каміла набірае пятнаццаць чалавек і ўсталёўвае сярэдні рынкавы кошт: з кожнага — 200 долараў за дзевяць анлайн-заняткаў даўжынёй дзве-тры гадзіны.

Агенцтва «Popcorn media» дзяўчына стварыла летась, калі зразумела: кліентаў шмат, а рукі ўсяго дзве. Сабрала каманду з тых, хто прайшоў яе курсы, і каго знайшла ў «Інстаграме». Зарэгістравалася як індывідуальны прадпрымальнік. Зараз у штаце працуюць менеджары, капірайтар, сторыз-мэйкер, ёсць фатограф і дызайнер.

— Наша задача — зразумець, якія ў кліента праблемы, — гаворыць прадпрымальніца, — чым можам дапамагчы і ці можам увогуле. Важна, наколькі мы падабаемся адно аднаму і наколькі спрацуемся. Бывае, што ў нас з кліентам проста кардынальна розныя погляды — і гэта нармальна.

Кошт аказаных паслуг у сярэднім 800 долараў у месяц. Калі лічыць рэкламныя бюджэты, можа даходзіць да 1100—1200 долараў.

...Акрамя двух бізнесаў, Каміла паспявала рыхтавацца да экзаменаў і здаваць іх на завочным аддзяленні журфака. Як? Яна што, не спала? Не. Проста ўмее правільна планаваць сваю працу і працу каманды. У выпадку чаго можа дaручыць усё свайму менеджару. У яе ёсць час, каб схадзіць на фітнэс ці на масаж, а таксама для вандровак. Дзе толькі ні была дзяўчына! У Рыме, Вільнюсе, Піцеры, Варшаве, на Кіпры...

— У маім бізнесе (менавіта ў агенцтве) сродкі цяжка класці сабе ў кішэню, — дакладна ведае дзяўчына, — бо грошы ідуць у абарот. І вымаць іх з яго няправільна! Ты купіш машыну, кватэру, а ўзнікне момант, калі табе трэба развіваць свой бізнес далей, а грошай уже абсалютна няма. З курсамі прасцей. З дзвюх тысяч долараў тысячу шэсцьсот магу ўзяць сабе. Я выбіраю: «круціць» іх далей, ці, напрыклад, ехаць на Балі.

На жыццё ў Мінску сыходзіць тысячы паўтары долараў. Тое, што зверху — на падарожжы і падарункі блізкім. Больш мне і не трэба. Магу ўкласці грошы ў дарагое навучанне. А вось транжырыць — не пра мяне...

Сям'я дзяўчыны адносіцца да заняткаў Камілы станоўча. Яна нават іх забяспечвае: «Не на сто працэнтаў, канешне. Мама працуе, бо не хоча кідаць работу, бацька ў пошуку. Ім нецікава сядзець на месцы. Але, калі трэба купіць штосьці дарагое, напрыклад, камп'ютар, ці бабулі трубы ў ваннай адрамантаваць — гэта ўсё я».



— Бізнесмен павінен... — пытаюся...

— ... трымаць адказнасць: быць адказным за сябе, свае праекты і нават за іншых людзей, за тое, што ён транслюе ў аўдыторыю, — упэўнена кажа прадпрымальніца. — Яшчэ трэба разумець, што бізнес заўжды трымае цябе ў стане нявызначанасці. Ты не ведаеш, што будзе заўтра. Прыйдзе ці сыдзе ад цябе кліент? Колькі грошай трэба будзе ўкласці? Пастаянна думаеш, што ты яшчэ можаш зрабіць, што яшчэ можаш адкрыць. А таксама кожны павінен умець хутка рэагаваць на цяжкія сітуацыі, не паддавацца паніцы, думаць, як вырашаць праблемы. І памятаць, што менавіта за прадпрымальнікам будзе апошняе слова.

...Каміла Жыбуля не збіраецца спыняцца на двух праектах. Грошы — не галоўная і не канчатковая мэта.

— Мне проста вельмі падабаецца мая работа, — кажа яна. — Галоўнае, што атрымліваю ад людзей «фідбэк» (зваротную сувязь. — **Аўт.**) Я, вядома, з імі шалёна стамляюся, правяраю заданні па начах... Але бачу, што з дапамогай маіх курсаў яны знаходзяць лепшую работу, заробак, адкрываюць свае агенцтвы, нарошчваюць кліенцкую базу. І гэта мяне матывуе.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

*Цікавае хобі*

# СВЕТ У ПАШТОЎКАХ І СЦЯГАХ

## Што ператварае сур'ёзнага юрыста ў шчаслівае дзіця

**Большую колькасць часу ў майго суразмоўніка займае любімая работа — па прафесіі ён юрыст. Дваццацісямігадовы Павел МАНОЙЛАЎ кажа, што недахопу станоўчых эмоцый у яго няма, аднак часам хочацца атрымліваць іх па-за межамі прафесійнай дзейнасці. У гэтым яму дапамагае хобі — калекцыяняванне. Хлопец збірае сцягі розных краін, а таксама паштоўкі, якія прыходзяць яму з усяго свету.**



***— Посткросінг увайшоў у ваша жыццё выпадкова?***

— Пра тое, што можна абменьвацца паштоўкамі з іншымі людзьмі, я даведаўся яшчэ падчас вучобы ва ўніверсітэце — каля васьмі гадоў таму. У адной з мясцовых газет прачытаў нататку пра посткросінг, і мяне гэты занятак зацікавіў. Сутнасць такая: рэгіструешся на сайце, атрымліваеш пяць выпадковых адрасоў, на якія ў далейшым трэба будзе адправіць картку ў рамках пэўнага часу. Ты, у сваю чаргу, таксама чакаеш сюрпрыз у паштовай скрыні. Такім чынам, адбываецца кругаварот паштовак па ўсім свеце. Не зважаючы на безліч кіламетраў, нацыянальнасць, узрост, палітычныя погляды або рэлігію з адпраўшчыкамі мы знаходзім агульную мову, дзелімся эмоцыямі і перажываннямі. Акрамя таго, з дапамогай такога хобі некаторыя знаходзяць сваіх сяброў або нават каханне.

**«Самая рэдкая ў маім спісе пазіцыя — маленькая астраўная дзяржава ў Ціхім акіяне — Палау. З паштоўкай адтуль звязана цікавая гісторыя».**

***— І колькі паштовак у калекцыі цяпер?***

— Больш за дзве тысячы. Калі толькі пачынаў збіраць іх, мяне прывабліваў найперш сам працэс. З часам колькасць экзэмпляраў павялічвалася, і ў мяне сфарміравалася асабістае меркаванне аб тым, што канкрэтна я хацеў бы атрымліваць. Цяпер увагу засяродзіў на некаторых серыях замежных выдавецтваў, многія з якіх цяжка набыць. Асаблівае месца адведзена паштоўкам з малюнкам сцягоў розных краін. Іх у мяне больш за 60, 50 з якіх — гэта сцягі дзяржаў, а астатнія — рэгіёнаў і міжнародных арганізацый.

***— Растлумачце, што значыць, рэдкія серыі?***

— Адна з іх мае назву «Pantone» (ад амерыканскай кампаніі інстытута колеру. — **Аўт.**), у наборы 100 штук, кожная картка мае свой колер, які не паўтараецца. Няма ні малюнкаў, ні подпісаў. Скажу шчыра, мае знаёмыя і сябры не падзяляюць любові да гэтай серыі, не бачаць у ёй прыгажосці, а мне падабаецца. Яшчэ адзін гонар — паштоўкі французскага мастака Вахрама Мурацьяна. Яны проста неверагодныя! Назва серыі — «Парыж супраць Нью-Ёрка», усе 50 экзэмпляраў у мяне ёсць. Творца супастаўляе тыповыя для абодвух гарадоў рэчы, абыгрывае мясцовыя стэрэатыпы. З нядаўняга часу звярнуў увагу на карткі з вокладкамі знакамітых часопісаў VOGUE, The New Yorker, а таксама на набор паштовак пад назвай «Жанчыны ў навуцы». І гэта далёка не ўсё, што ў мяне ёсць.

***— З адваротнага боку вашых картак — прыгожыя малюнкі і подпісы. Займаецеся гэтым самастойна?***

— Так, мне падабаецца, калі іх афармленне нагадвае асобны твор мастацтва. Калі сам пішу там штосьці важнае, фіксую яркія падзеі жыцця. А часам прашу дапамагчы з гэтым знаёмых.



Напрыклад, вось работы Міці Післяка *(паказвае некалькі экзэмпляраў)*, знакамітага мінскага стрыт-арт-мастака, ілюстратара.

***— Ці ёсць «асаблівыя» экзэмпляры, якія кранаюць душу?***

— Аднойчы з Германіі прыйшла паштоўка, у якой жанчына падзялілася са мной сваім горам. У яе памерла маці, а захапленне посткросінгам дапамагло пазбавіцца ад дэпрэсіі і сысці ад дрэнных думак. Цяпер, калі ў мяне кепскі настрой, я нагадваю сабе, што гэта не канец свету. Ёсць яшчэ адна гісторыя, звязаная з посткросінгам. Адзін хлопчык, які быў зарэгістраваны на сайце, абвясціў пра тое, што ў яго апошняя стадыя раку і яго мара — атрымаць мільён паштовак. Мяне вельмі кранула гэта, я з вялікай пяшчотай выбіраў яму падарунак. На жаль, мая пасылка не дайшла да хлопчыка, але яго мара ажыццявілася — ён атрымаў нашмат больш, чым яму хацелася.

***— Што вас найбольш прыцягвае ў хобі?***

— Лічу, што гэта ўнікальны праект, ён даказвае: усе межы і адрозненні існуюць толькі ў нас у галаве. Я веру, што кожная атрыманая паштоўка — гэта нешта большае, чым проста кавалак размаляванага кардону, гэта часцінка душы адпраўшчыка. Прытрымліваючыся гэтага прынцыпу, вельмі трапятліва стаўлюся да кожнага паслання і настолькі ж старанна падбіраю карткі, падпісваю іх сваім адрасатам. Прыемна, што магу ашчаслівіць кагосьці маленькім падарункам. Часцей за ўсё днём я сур'ёзны, засяроджаны юрыст, а ўвечары, адкрыўшы паштовую скрыню, шчаслівае дзіця. Асабліва задавальненне атрымліваю, калі «сябры па паштоўках» улічваюць мае пажаданні. Напрыклад, нядаўна з Фінляндыі прыйшла

**«Быў выпадак, калі перад днём нараджэння паўгода забараняў сабе адчыняць паштовую скрыню, каб быў сюрпрыз. Калі час надышоў, атрымаў шмат станоўчых пачуццяў».**

адна картка з маркай «Еўрабачання» — я фанат гэтага конкурсу. Да таго ж, я, як і многія, вельмі люблю падарожжы, але ў сілу розных прычын — ляноты, занятасці на рабоце, моцнай прывязанасці да дома — раблю гэта не часта. Таму посткросінг — гэта мой спосаб убачыць свет, не выходзячы з кватэры.

...Заўважыла, што суразмоўнік пачаў загадкава ўсміхацца. Пытаюся, у чым справа.

— Быў выпадак, калі перад днём нараджэння паўгода забараняў сабе адчыняць паштовую скрыню, каб быў сюрпрыз. Калі час надышоў, разам з безліччу паштовак — а іх было больш за 60 — атрымаў шмат станоўчых пачуццяў. А яшчэ я адпраўляю сабе паштоўку нават з арміі!

***— А ці затратна мець такое захапленне?***

— Акрамя выдаткаў за перасылку і за саму паштоўку больш нічога не трэба. Пажадана ведаць англійскую мову, бо сайт англамоўны (хоць часам прыходзяць паштоўкі, падпісаныя па-кітайску). Ведаеце, некаторыя выкідваюць тыя паштоўкі, якія ім прыходзяць, маўляў, не вельмі прыгожыя. Але я стаўлюся да тых, хто мне іх адправіў, з вялікай удзячнасцю, таму ўсе захоўваю: асноўныя калекцыі ў альбомах, астатнія — у спецыяльных скрынках.

***— У якую краіну адпраўляеце карткі часцей за ўсё, а ў якую яшчэ не даводзілася?***

— Асабістую старонку на сайце посткросінгу я вяду з 2011 года. Калі абапірацца на статыстыку, то на сённяшні дзень маю ў актыве 45 краін, у якія пайшлі мае пасылкі, і 45 краін — адкуль яны прыйшлі. Самыя папулярныя — ЗША і Германія, адтуль, дарэчы, амаль ніколі не бывае праблем з дастаўкай. Самая рэдкая ў маім спісе пазіцыя — маленькая астраўная дзяржава ў Ціхім акіяне — Палау. З паштоўкай адтуль звязана цікавая гісторыя. Хтосьці падарожнічаў і апавясціў удзельнікаў посткросінгу, што можа адправіць адтуль абмежаваную колькасць паштовак. Зразумела, попыт быў вялікі. Адна з іх дасталася мне — я быў вельмі рады!

***— Бачу, у вас таксама сабралася немаленькая калекцыя сцягоў...***

— Не магу растлумачыць прычыну сваёй любові да іх. Разумею, што для многіх гэта нетыповае хобі. Пачалося яно са школы, дзе любімым прадметам была геаграфія. Ва ўніверсітэце, дзе вучыўся па спецыяльнасці «міжнароднае права», паглыбіўся ў тэму яшчэ больш. Цяпер я ведаю сцягі большасці краін. У маёй калекцыі іх пакуль 20, але хацелася б сабраць усе. Гэта цяжка, улічваючы тое, што ў некаторыя краіны дастаткова цяжка трапіць, але марыць не забараняецца *(усміхаецца)*. Акрамя таго, сцягі прываблiваюць мяне эстэтычна.

***— Дзе вы захоўваеце іх? Мабыць, вісяць па ўсёй кватэры?***

— Не люблю, калі яны знаходзяцца на бачным месцы. А калі дрэнны настрой, дастаю іх, раскладваю, разглядаю, гэта дапамагае. Сцягі псуюцца з-за мыцця і сонечнага святла. А я вельмі трапятліва стаўлюся да кожнага экзэмпляра, таму нават калі б хтосьці папрасіў у мяне адзін у якасці падарунка — адмовіў бы. Гэта не значыць, што я не дазваляю сваім сябрам дакранацца да іх, наадварот, з вялікім задавальненнем дэманструю ўсім, хто зацікавіўся.

**«Цяпер я ведаю сцягі большасці краін. У маёй калекцыі іх пакуль 20, але хацелася б сабраць усе».**

***— У вас больш падараваных экзэмпляраў або набытых самастойна?***

— Свой першы сцяг я купіў у Італіі. З таго часу, калі прыязджаю ў незнаёмую краіну, першая задача — адшукаць менавіта гэтую рэч. Аднак, як ужо казаў, я не так часта падарожнічаю, таму ў большасці выпадкаў мне іх прывозяць знаёмыя і сябры ў якасці падарунка. Зразумела, заўсёды хочацца атрымаць максімальна дапушчальны памер сцяга, але гэта бывае затратна або фізічна немагчыма. Іншым часам здаецца, што мы сустракаемся з сябрамі толькі для таго, каб я змог забраць чарговы экзэмпляр, таму бывае няёмка. Па натуры я перфекцыяніст, таму люблю, каб усё было «як трэба». У сцяга кожнай краіны свае прапорцыі. Напрыклад, у Швейцарыі і Ватыкана палотнішча квадратнае, таму важна, каб гэта не было праігнаравана. А ў астатнім правілаў няма, магу нават дубліраваць сцягі, калі яны адрозніваюцца памерам або матэрыялам.

***— Сцяг якой краіны падабаецца вам больш за ўсё?***

— Паўночнай Македоніі — чырвоны і жоўты колеры здаюцца мне прыгожымі. Прамяністае сонца на палатне адразу ўзнімае настрой — узнікае пачуццё, што ў гэтай краіне ніколі не бывае дрэннага надвор'я. Сцяг Албаніі таксама лічу вельмі эстэтычным.

***— Ці ёсць у вас іншыя захапленні, акрамя калекцыянавання?***

— Усё, што звязана з творчасцю, даспадобы. На жаль, у мяне не так шмат часу на тое, каб займацца чымсьці напоўніцу. Але ўсё ж такі малюю, і нават размалёўваю — усё, як у дзяцінстве, толькі размалёўкі іншыя, больш складаныя. Мой любімы ілюстратар — Кербі Разанэс.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Анастасіі ГАНЦАЎСКАЙ.**

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов:

- полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1813237, 1813238;
- полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН, 2РП серии НС № 0045404;
- полис «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН, 2РП серии БИ № 0064814.

УНП 100782388

## ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Комитетом «Гроднооблимущество» проводиться аукцион по продаже здания школы, интерната с принадлежностями, расположенного по адресу: Волковысский район, деревня Малая Лапеница, улица Школьная, дом 1, 1/1, 1/2, 1/3, 1/4, 1/5. Начальная цена продажи – 61 279 рублей 44 копейки; размер задатка – 6 200 рублей.

АУКЦИОН СОСТОИТСЯ **10 октября 2019 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, дом 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе: **4 октября 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация по телефонам: в городе Волковыске (801512) 4-50-25, 4-53-83; в городе Гродно (80152) 772915, 722518, 722102, а с 08.10.2019 – тел. 8 (0152) 623924, 623923, 623931, сайты http://www.region.grodno.by, gki.gov.by.

УНП 500842593

ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует **о снятии с электронных торгов, назначенных на 16.10.2019 в 11.00** (публикация извещения в газете «Звязда» от 12.09.2019), **капитального строения** (магазин (здание специализированное розничной торговли), **инв. номер 124/С-17635, общ. пл. 520,6 кв. м,** расположенного по адресу: **Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Коссовская, 7А.**

**Контактный телефон +375 (44) 704 92 06, e-mail: auction@cpo.by**

**УНП 191224638**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**

Месторасположение **– Гродненская обл., г. Гродно, пер. Победы, 5**

**Производственная база** в составе: **здание склада** (696,8 кв. м 400/С-25199, составные части: покрытия асфальтобетон, цементно-бетонное, ограждение кирпичное, линия электропередачи), **склад (мастерские)** (921,1 кв. м, 400/С-25198, составные части: склад, теплоузел), **навес** (294,6 кв. м, 400/С-25204, составные части и принадлежности: покрытие асфальтобетонное, ограждение кирпичное, водопроводная сеть), **навес** (122,2 кв. м, 400/С-43272), **производственный корпус** (1528,2 кв. м, 400/С-25202), **административное здание** (429,1 кв. м, 400/С-25203, составные части: покрытия асфальтобет. и цементо-бетон., подпорная стена, ограждения кирпичное и металлич., ворота, калитка, водопроводная сеть, канализационная сеть, линия электропередачи), участки многолетних насаждений (инв. № 0000609, 0000610, 0000617), системы тревожной сигнализации (инв. № 47069), охранной (инв. № 0000466) и видеонаблюдения (инв. № 47067), котел стальной твердотопливный КСТБ-95 (инв. № 0000251, 0000250) и КЧУ-7-63А (инв. № 40002).

***Сведения о земельных участках:*** пл. **1,4381** га (обременения – сервитут 0,0625 га), **0,2078** га **0,3867** га (обременения – охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, канализации) предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 279 591,49 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Обременения:** на момент публикации извещения площади зданий частично сданы в аренду, здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 12.07.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 07.10.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 03.10.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704 92 06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1**

Месторасположение: **Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53**

**Производственная база** в составе: **здание механизированной мойки** (350/С-163612, 127,3 кв. м, составные части: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения), **КПП стоянки автотранспорта** (350/С-163639, 53,2 кв. м), **навес со смотровой ямой (мехмойка)** (350/С-163641, 76 кв. м, смот. яма), **очистные замазученных и ливневых вод** (350/С-170152, составные части: закрытый горизонтальный отстойник), **дорожное покрытие** (350/С-170155), **забор** (350/С-170153, 386 м, составные части: 4 ограждения, ворота), **тепловая сеть** (350/С-163618148,9 м, составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец (1 шт.), **производственный водопровод** (350/С-163611, 213,3 м, составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.), **дождевая канализация** (350/С-163609, 234,3 м, составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприемник).

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 202 743,77 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Лот № 2**

Месторасположение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 61**

**Производственная база** в составе: **здание балансирной пилы** (350/С-163118, 318,3 кв. м, **здание с вертикальной планировкой** (350/С-77096, 6544,4 кв. м, **склад парафина** (350/С-166028, 78 кв. м, **здание подготовительного корпуса цеха 85** (350/С-47999, 1421,4 кв. м, **эстакада** (350/С-166026, 140 кв. м, **благоустройство** (350/С-186307, 3084,5 кв. м составные части: ограждения и покрытия), **канализация** (350/С-184597, 322,4 кв. м, **водопровод № 1** (350/С-184588, 165,7 м), **теплосети наружные № 1** (350/С-184593, 434,9кв. м.

***Сведения о земельных участках:*** предоставлены Продавцу на праве постоянного пользования (ограничения – водоохранная зона водных объектов) для содержания и обслуживания здания с вертикальной планировкой и склада парафина – пл. **0,8942** га, здания подготовительного корпуса цеха 85 – пл. **0,3817** га, здания балансирной пилы – пл. **0,2416** га

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 147 061,80 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 3**

Месторасположение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 61/1**

**Здание конторы** (350/С-161796, 629,1 кв. м).

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу общ. пл. **0,0614** га на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания конторы (ограничения – водоохранная зона)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 445 440,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 4**

Месторасположение: **Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Александровка**

**Производственная база** в составе: **цех СОУ (арочник)** (340/С-294759, 139,6 кв. м), **склад материалов** (340/С-295182, 13,8 кв. м), **склад ГСМ** (340/С-295183, 36,5 кв. м), **овощехранилище** (340/С-294758, об. пл. 77,3 кв. м), **столовая** (340/С-290646, 146 кв. м), **гараж** (340/С-290647, 792 кв. м), **здание конторы** (340/С-290645, 241,1 кв. м, составные части: котельная, тамбур, сварочная), **забор металлический** (инв. № 200030), **станок СОУ-1** (инв. № 1782), **транспортер удаления отходов для станка СОУ** (инв. № 6707), **мачта осветительная** (инв. № 6709), кран-балка с талью (инв. № 6706).

Сведения о земельных участках, предоставленных Продавцу на праве постоянного пользования общ. пл. 4,6746 га (для размещения объектов недвижимости), 2,9808 га (для содержания и обслуживания производственной базы), 0,4706 га (для обслуживания гаража), пл. 0,2343 га (для обслуживания здания конторы). Ограничения – прибрежная полоса водных объектов, охранные зоны линий электропередачи

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 184 787,13 бел. руб.** (снижена на 20 %)

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лоту № 1 – 27.06.2019, по лотам № 2, 3 – 16.08.2019, по лоту № 4 – 11.07.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Аукцион состоится 22.10.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 21.10.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

УНП 400021353

# ИЗВЕЩЕНИЕ
# о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» в составе

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Котел газогенераторный и отопительный ВКГ-95, заводской № 005 не введен в экспл. | 1 660,00 | 166,00 |
| 2 | Оборудование | 1 907,70 | 190,00 |
| 3 | Оборудование и лом цветных металлов | 12 550,29 | 1 255,00 |
| 4 | Оборудование | 93 948,30 | 9 394,00 |

С полным перечнем имущества, входящего в состав лотов, можно ознакомиться на сайте https://bankrot.gov.by.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона (по лотам №№ 1, 2, 3) и в размере 5 % (по лоту № 4) и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **22.10.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.10.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**



УТВЕРЖДЕНО
Решение общего собрания участников иностранного общества с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент» от 5 сентября 2019 г. № 05-09/2019

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ИНОСТРАННОГО ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ЗОМЕКС ИНВЕСТМЕНТ»

1. Пункт 1.2 раздела 1 Проспекта эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска ИООО «Зомекс Инвестмент» изложить в следующей редакции:

«1.2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес, официальный интернет-сайт

Республика Беларусь, 220114, г. Минск, ул. Петра Мстиславца, д. 9, пом. 3, каб. 9;

телефон: 8 (017) 2693260, номер факса: 8 (017) 2693250;

электронный адрес (e-mail): info@bir.by;

официальный интернет-сайт: www.bir.by (далее – сайт Эмитента).»

2. Остальные пункты Проспекта эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска ИООО «Зомекс Инвестмент» остаются без изменений.

Директор иностранного общества с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент» Милица Василевич

Главный бухгалтер иностранного общества с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент» Р.К. Ефимова

**УНП 191061449**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, тел./факс 801562-6-30-29 |

**Предмет аукциона**
**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Гродненская обл., слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13**

| Наименование (назначение) | Общ. площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| Нежилое здание (здание нежилое) | 415,5 кв. м | 450/С-24046 |
| Электрическая сеть (сооружение специализированное энергетики) | 6,0 м | 450/С-23996 |
| Водопроводная сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 79,0 м | 450/С-23995 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0457 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий по ул. Я. Купалы, 13

**Начальная цена с НДС 20 % – 38 774,56 бел. руб.**

**Условие аукциона:** вовлечь в хозяйственный оборот объект недвижимости с момента заключения договора купли-продажи, а в случае проведения реконструкции (строительство, сноса недвижимого имущества) – в сроки, определенные разработанной проектно-сметной документацией

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 23.10.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.10.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Автокомбинат № 6», 220029, г. Минск, пер. Физкультурный, 22 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение –** г. Минск, ул. Ванеева, 29

| № лота | Наименование |
|---|---|
| 1 | Автомобиль ЗИЛ ММЗ 45085 (рег. знак КЕ 8760) – 1 300,00 бел. руб. навигационный контроллер SAT-LITE-2 (инв №45615) – 20,84 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 1 320,84** (Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 66,04) |
| 2 | Грузовой специальный самосвал MAZ 551605-271, рег. знак АК 5296-7, 2011 г. в. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 25 120,00** (Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 1 256,00) |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Валюкевич Владимир Аркадьевич, контактный телефон +37529 623 22 96

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору и продавцу торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение организатору в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 02.07.2019 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 07.10.2019** в 11.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 04.10.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой»

| Лот | Наименование | Адрес | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13493, площадь 373,2 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание гаража | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 5 | 16 262,40 | 813,12 | 813,12 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13496, площадь 159,7 кв. м, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание котельной | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 11 | 2 798,40 | 139,92 | 139,92 |
| 3 | 1. Капитальное строение с инв. № 633/С-13497, площадь 450,2 кв. м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание мастерских; 2. Эстакада при мастерской с инв. № 28 | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная. д. 4, корп. 8 | 17 160,00 | 858 | 858 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13490, площадь 355,5 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание пилорамы | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 6 | 13 939,20 | 696,96 | 696,96 |
| 5 | 1. Капитальное строение с инв. № 633/С-13492, площадь 211,3 кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – здание РБУ. 2. Эстакада для разгрузки при РБУ с инв. № 2057 | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 12 | 52 588,80 | 2 629,44 | 2 629,44 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13487, площадь 287,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада хозяйственного | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 10 | 9 134,40 | 456,72 | 456,72 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13494, площадь 366,7 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание столярного цеха | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 7 | 15 470,40 | 773,52 | 773,52 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13498, площадь 211,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 2 | 9 345,60 | 467,28 | 467,28 |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13486, площадь 6,4 кв. м, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – туалет | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 3 | 950,40 | 47,52 | 47,52 |
| 10 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13485, площадь 89,9 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – сарай | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4, корп. 1 | 1 636,80 | 81,84 | 81,84 |
| 11 | Капитальное строение с инв. № 633/С-13484, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водонапорная башня | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная | 3 696,00 | 184,8 | 184,8 |
| 12 | 1. Подъездные пути к ОГМ с инв. № 2055; 2. Ограждение площадки с инв. № 2053 | Минская обл., г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4 | 61 776,00 | 3 088,8 | 3 088,8 |

Вышеуказанные лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624050100001001503, который является неделимым. Площадь – 3,9415 га. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадь – 3,9415 га

*Торги в отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. Окончание приема заявлений в 18.00 30.09.2019*

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.
Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by. на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 02.10.2019 г. в 12.00 (регистрация участников с 11.50 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержится на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi
До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.
Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.
Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Шукелович Чеслав Зенонович, тел. 8 (029) 999 91 12.
Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера», тел. 8 (029) 305-86-50, e-mail: frondera@mail.ru**

---

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района:

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ

1. Здание комплексно-приемного пункта, дорожка по ул. Центральная, 20Б в аг. Волпа Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 7 770 руб.
Размер задатка – 800 руб.
2. Комплекс объектов нежилого здания по ул. Медведева, 99А в г. Волковыске.
Начальная цена предмета аукциона – 21 440 руб.
Размер задатка – 2 150 руб.

Аукцион состоится – **10 октября 2019 года в 11.30**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **4 октября 2019 года до 17.00.**
Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 4 50 25, 2 06 03.
в городе Гродно 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.
Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by.

**УНП 500042135**

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, Тел./факс 801562-6-30-29 |

**Предмет аукциона**
**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Здание проходной** (здание специализированное иного назначения) | 81 кв. м | 450/С-18991 |
| | **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 209,7 кв. м | 450/С-18988 |
| | **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 107 кв. м | 450/С-18989 |
| | **Здание столярного цеха** – мастерской (здание специализированное для бытового обслуживания населения) | 573 кв. м | 450/С-18992 |
| | **Склад (баня)** (здание многофункциональное) | 318 кв. м | 450/С-18993 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,5179 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции

**Начальная цена с НДС 20 % – 85 842,00 бел. руб. (снижение 5 %)**

**Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Школьная**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 2 | **Здание магазина № 2** (здание специализированное розничной торговли) | 103,8 | 450/С-1974 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0247 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина

**Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by**

**Начальная цена с НДС 20 % – 35 318,40 бел. руб. (снижение на 20 %)**

**Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 3 | **Столовая** (здание специализированное для общественного питания) | 672,7 кв. м | 450/С-18925 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,1316 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1316 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 250 093,19 бел. руб.**

**Условие аукциона:** вовлечь в хозяйственный оборот объект недвижимости с момента заключения договора купли-продажи, а в случае проведения реконструкции (строительство, сноса недвижимого имущества) – в сроки, определенные разработанной проектно-сметной документацией

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2019 г.

**Аукцион состоится 10.10.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.10.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

SEX=БАЛЯСЫ

# ПРАГНАСЦЬ ВАМ ІМЯ?

**Памятаеце гэты анекдот? «— Любы, ты ведаеш, што я хачу? — Усё!? — Гэта па-першае...» Усе ж даўно ведаюць пра гэтую рысу жаночага характару і ставяцца да яе з гумарам. Аказваецца, што не ўсё так проста і бяскрыўдна... Нядаўна сацыёлагі высветлілі, што траціна дзяўчат ходзіць на спатканні дзеля... бясплатнай вячэры. («— Сяджу ў кавярні, да мяне падыходзіць хлопец і пытаецца: «Што аплаціць дзяўчыне?» Ну, я не разгубілася і прад'явіла рахункі — за кватэру, святло, газ...») Да такіх нечаканых высноў прыйшоў амерыканскі вучоны з універсітэта горада Азуса Браян Колісан са сваёй камандай. Вынікі іх назіранняў былі апублікаваныя ў часопісе SPPS.**



Адзначаецца, што перадумовай для такога даследавання сталі апублікаваныя ў амерыканскіх СМІ шматлікія аповеды пра тое, як прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва ідуць на спатканні дзеля бясплатнага пачастунку. («— Заходзіць дзяўчына ў краму. Прадавец, усміхаючыся, пытаецца: — Чаго хоча дзяўчына? Тая адказвае: — Дзяўчына хоча «Марціні», «Бэнтлі», мужыка добрага і сексу рэгулярнага, але... прыйшла яна па хлеб».) Каб праверыць гэтае меркаванне, вучоныя набралі групу з 800 дзяўчат-добраахвотніц. Выніκі эксперымента здзівілі нават саміх даследчыкаў.

Складзены псіхалагічны партрэт дапамог вучоным вызначыць пэўны тып жанчын, якія карысталіся такім карыслівым метадам. («— Я ж чаму для цябе недаступная была? Я ж думала, у цябе грошай няма».) Усе яны мелі так званую «цёмную трыяду»: пакутавалі ад нарцысізму, макіявелізму і псіхапатыі, а таксама прытрымліваліся строгіх традыцыйных уяўленняў аб сацыяльных ролях мужчын і жанчын. («Алічбаваная, зачараваная, з інтэрнэтам навекі павянчаная, ты сядзіш, да манітора прыкаваная, а быццам бы цалкам дарослая! То вясёлая, то сумотная, у сетку з чацвёртага разу патрапіла, ты не тое каб зусім ненармальная, але крыху ўжо звар'яцелая».) У абарону дзяўчат даследчыкі дадалі, што такі адказ маглі даць і ты добраахвотніцы, якія проста не захацелі прызнацца, што іх спатканне прайшло няўдала. («І запомніце, дзяўчаты, што малады, прыгожы, разумны, багаты, вясёлы і не скнапны — гэта шэсць розных мужыкоў».) Дарэчы, амерыканскія сацыёлагі дадалі, што падобныя формы паводзін могуць быць характэрныя не толькі для прадстаўніц слабага полу, але і для мужчын. («Сёма кінуў сваю дзяўчыну, паколькі лічыў, што яна з ім сустракаецца дзеля грошай, якія ён ёй павінен».)

А як вам навіны з Расіі? Напачатку там у Дзярждуме раскрытыкавалі моладзь за бездакназнасць у пытаннях шлюбу і папракнулі ў жаніцьбе дзеля... вясельнай урачыстасці. Пра гэта заявіла старшыня камітэта па пытаннях сям'і, жанчын і дзяцей Тацццяна Плятнёва. («— Лена, ты не ведаеш, што хоча ў падарунак твой муж, а то нам сорамна спытаць. — Ён хоча боты жаночыя, італьянскія, 38-га памеру, але саромеецца прызнацца... І мультыварку...») Па яе словах, маладыя расіяне не бяруць на сябе адказнасць за скасаванне шлюбу, паколькі для іх больш важнае свята, якое робіцца на грошы бацькоў. Чыноўніца заўважыла, што прычына такіх паводзін — у адсутнасці выхавання. («Два гады з ёй сустракаўся. І ўсё было добра. Потым пачалося: як цябе завуць? а ці не жанаты ты?»)

Далей — больш. У Расіі склалі рэйтынг гарадоў па... прагнасці жанчын. У федэральным сацапытанні, якое правяло незалежнае агенцтва Zoom Market, у 28 гарадах задавалі тры пытанні: які для вас галоўны крытэрый пры выбары мужчыны, ці маюць значэнне фінансавы стан і ўзрост? Рэйтынг атрымаўся такі: каханне (62 працэнты), надзейнасць (19 працэнтаў), даход (7 працэнтаў), сацыяльны статус (5 працэнтаў), знешнасць (4 працэнты), адукацыя (2 працэнты) і рэпутацыя (1 працэнт). Было агучана, што самыя прагныя жанчыны жывуць у Саранску, Краснадары і Маскве.

Гэта прытым, што нядаўна расіянкам далі параду, што рабіць ва ўмовах дэфіцыту мужчын. («Недахоп інтымнага жыцця ў дзяўчыны — гэта калі яна раскладвае пасьянс і зайздросціць даме, якая ляжыць паміж валетам і каралём».) Каментуючы даныя Расстата, псіхолаг Павел Жаўнераў заявіў: жанчынам трэба перастаць канкурыраваць паміж сабой, а ўвагу скіраваць на павелічэнне ўзроўню шчасця мужчыны, што побач. Тады той ахвотней пагодзіцца на шлюб. («Калі мужчына кахае жанчыну, тараканы ў яе галаве здаюцца яму божымі кароўкамі».) А яшчэ неабавязкова шукаць сабе найбольш паспяховага і багатага партнёра: галоўнае, маўляў, каб чалавек добры быў. («Самы шчаслівы ранак для дзяўчыны — дзень яе вяселля. Прачнуўшыся, яна ведае, што апрануць».) І ў той жа час эксперт падкрэсліў, што ва ўмовах дэфіцыту мужчын у краіне жанчынам трэба хутчэй вызначацца з партнёрам і задумвацца пра шлюб. («— Ало, гэта міліцыя? — Так, што ў вас здарылася? — Дзве дзяўчыны б'юцца адна з адной з-за мяне. — Малады чалавек, а ў чым, уласна, праблема? — Страшненькая перамагае!»)

Дык вяселле ці «не» святу?! Скончым тым, з чаго пачалі, — анекдотам. «— Дзяўчына, вы танцуеце? — Не. — Тады не будзем губляць час».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Паркур — толькі вуліца, толькі асфальт!»



**Караліна Аруцюнян.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— А сёння паркур папулярны сярод моладзі? — пытаюся ў дзяўчат.

— Людзей, якія актыўна ім займаюцца, у Беларусі няшмат, амаль усе адзін аднаго ведаюць. Накірункам цікавяцца многія, але няма фінансавай падтрымкі. Для любога спартсмена важна ўдзельнічаць у розных спаборніцтвах, а ў нас яны праводзяцца толькі два разы ў год — вясной і восенню. Зразумела, мы з задавальненнем выступаем на іх, але хочацца большага, — дзеліцца Караліна.

— Для тых, хто займаецца паркурам, няма розніцы, дзе трэніравацца: на вуліцы або ў зале. Аднак у памяшканні можна толькі адпрацоўваць трукі, там мяккія маты і не страшна, калі што, падаць, а пасля — толькі вуліца і асфальт. На свежым паветры ёсць раздолле для фантазіі — рабі што хочаш. Мы імкнёмся не займацца на адной пляцоўцы пастаянна — усюды розныя бардзюры, борцікі, асфальт, гэта ж цікава! — лічыць Вікторыя.

Суразмоўніцы падзяліліся, што спорт іх суправаджае з маленства.

— З сямі да васямнаццаці гадоў я займалася спартыўнай гімнастыкай, пасля — лёгкай атлетыкай. Цяпер увесь вольны час адводжу трэніроўкам па паркуры, — кажа Караліна.

— А я з сямі гадоў пачала займацца спартыўнай гімнастыкай, пасля акрабатыкай. Калі пераехала ў Мінск з Маладзечна, была ўпэўнена, што з мяне хопіць, не хачу нічым займацца. Але прайшло некалькі месяцаў, — стала сумна, пачала шукаць нешта актыўнае і цікавае. Знайшла сябе ў чэрлідынгу і ў кікбоксінгу. Ездзіла на чэмпіянаты міра, чэмпіянаты Еўропы, але сумяшчаць гэта з работай і паркурам аказалася цяжка, таму сышла з чэрлідынгу. Цяпер, калі ёсць настрой і вольны час, займаюся паркурам, а ў асноўным рыхтуюся да чэмпіянату свету па кікбоксінгу, які пройдзе ў лістападзе, — працягвае Вікторыя.

Як праходзяць трэніроўкі па паркуры? Дзяўчаты гавораць, што галоўнае — мець добры настрой. Ніякіх джынсаў і чаравікаў — толькі спартыўная форма і якасны абутак, каб не траўміравацца. А яшчэ паркуршчыцам дастаткова ўбачыць лесвіцу, борцік або бардзюр, каб імгненна пачаць пераадольваць перашкоду.

— Знаходзіцца ў добрай фізічнай форме і пазбягаць пераломаў дапамагаюць фізічныя нагрузкі. Я, напрыклад, перыядычна наведваю трэнажорную залу. Таксама для любога спартсмена важна збалансаванае харчаванне, але ў нас няма мэты пахудзець, таму і абмежаванняў таксама не маем, — кажа Караліна.

— Перыядычна чую, што паркур — небяспечны кірунак, але так можна казаць пра што заўгодна! Калі падыходзіць да трэніровак з цвярозым разумам, то ніякіх сур'ёзных траўмаў не будзе, — упэўнена Вікторыя.

Пытаюся, ці бывае няёмка дзяўчатам на трэніроўках у кампаніі хлопцаў...

— Сарамлівасць не сыходзіць, але калі ўзровень падрыхтоўкі павышаецца, упэўненасці ў сабе становіцца больш. Хлопцы заўсёды нас падтрымліваюць, іншым часам занадта, — з усмешкай гаворыць Караліна.

— Страхаў таксама хапае, але мы канцэнтруемся толькі на тым, што нам патрэбна. Напрыклад, я вельмі баюся вышыні, а ў паркуры яна ўсюды. Таму проста не думаю пра гэта, гавару сабе: «Ты з усім справішся». Дарэчы, у нас з Каралінай розныя падыходы да трэніроўкі: калі яна хвалюецца, пачынае бегаць вакол пляцоўкі кругамі, я наадварот — стаю нерухома на адным месцы, — дадае Вікторыя.

Суразмоўніцы дзеляцца, што знаёмыя і некаторыя сябры лічаць іх хобі нечым дзіўным — маўляў, як дзяўчыны могуць прыгаць па сценах, круціцца на галаве і выконваць цяжкія трукі нароўні з хлопцамі? Часам бывае і негатыўная рэакцыя ад навакольных людзей:



**Як вам такія скачкі?!**

— На кожнай трэніроўцы да нас хтосьці падыходзіць і гаворыць непрыемныя словы. А мы не разумеем, навошта псаваць нам настрой, мы ж нікога не чапаем, нічога дрэннага не робім, калі перашкаджаем руху іншых — спыняемся, чакаем, пакуль усе пройдуць. Часта чуем выказванні кшталту: «Ты ж зараз разаб'ешся», — гэта збівае з правільнага думак і пакідае дрэнныя. Нашы бацькі ведаюць, чым мы займаемся, яны звыкліся, што мы заўсёды чымсьці захопленыя, — расказваюць спартсменкі.

Дзяўчаты прызнаюцца, што з трэніровак звычайна вылазяць толькі ўначы.

— Мы ўсё сумяшчаем з паркурам. Прагулкі, кіно, экскурсіі — гэта адбываецца дзесьці паміж трэніроўкамі, можам з раніцы да вечара скакаць і не заўважыць, як праляцеў час. Ідэальны варыянт на будучыню для нас — трэніравацца суткамі напралёт і зарабляць на гэтым грошы, — кажа Караліна.

— Мы ўпёртыя і мэтанакіраваныя — гэта нам дапамагае. Паркур не трымае побач з сабою ленавых, і крута тое, што ў ім няма межаў. Калі ў нас штосьці не выходзіць — злуёмся, але ніколі не плачам, — працягвае Вікторыя.

Цікава, чым больш за ўсё прыцягвае Караліну і Вікторыю маладзёжны вулічны від спорту?

— Паркур — гэта свабода ў рухах і ў думках. Тут ёсць толькі адно правіла — заставацца сабою, шукаць свой стыль і адметнасць. Зразумела, што на пачатковым этапе ўсе штосьці ў кагосьці пераймаюць, але з цягам часу павінна з'яўляцца індывідуальнасць. Цяпер мы як гімнасткі амаль заўсёды адчуваем, як правільна выконваць звязкі і трукі, а як лепш не рабіць, — расказвае Караліна.

— Аднак так было не заўсёды. Спачатку былі памылкі, ад якіх цяжка пазбавіцца: нацягнутыя насочкі ног, прамое цела... у паркуры ж наадварот, мы гнуткія, рухі — натуральныя, — дадае Вікторыя.

— У ім шмат кірункаў. Які вам бліжэйшы? — пытаюся ў дзяўчат.

— Мне больш падабаецца «speedrun» — калі рухі ацэньваюцца на хуткасць, а Віцы фрыстайл — аўтарская звязка элементаў (калі ты сам выбіраеш, у якім стылі рухацца і што паказваць. — **Аўт.**). Дарэчы, гэтай вясной у сталіцы мы ўпершыню прынялі ўдзел у спаборніцтвах па паркуры — «Street Gamez». Нерваваліся, але ўсё прайшло вельмі ўдала, — меναвіта па гэтых кірунках сталі найлепшымі, хоць саперніц было няшмат, — гаворыць Караліна.

— Амаль усе спартсмены — перфекцыяністы. Мы не любім паўтараць, вывучаем новыя элементы падчас кожнай сустрэчы. Таксама сочым за вядомымі спартсменамі, іх поспехамі ў сацсетках, бяром штосьці на заметку. Спадзяёмся, у далейшым мы таксама прымем удзел у маштабных спаборніцтвах, — падагульняе Вікторыя.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіваў герaінь.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 18.09.2019 г.

## Нашы кнігі

# ЕЎРАТУР ПА СЛЯДАХ ПЕРШАДРУКАРА

**Выдавецкі дом «Звязда» сумесна з кнігарняй «Светач» прэзентаваў кнігу журналісткі і пісьменніцы Інесы Плескачэўскай «Гістарычныя прагулкі з Францыскам Скарынай».**

— Ідэя паехаць па еўрапейскіх гарадах Скарыны ўзнікла напярэдадні 500-годдзя выхаду яго першай кнігі. Менавіта тады мы адправіліся ў першыя вандроўкі па слядах асветніка і першадрукара. Кракаў — горад, дзе ён вучыўся. Падуя, дзе ён бліскуча абараніў вучоную ступень доктара лекарскіх навук. Дарэчы, гэтым дасягненнем ён вельмі ганарыўся, бо змяшчаў звесткі пра сваю адукацыю амаль у кожнай кнізе. Пасля была Прага — горад, які па праве можна назваць калыскай беларускага друку, таму што там Францыск Скарына выдаў свае першыя кнігі. Вільня — места, дзе ён ажаніўся, нарадзіліся яго дзеці і дзе, як пісалі ў Вялікай савецкай энцыклапедыі, «ён заснаваў першую на тэрыторыі СССР друкарню». У 2022 годзе літоўцы будуць шырока адзначаць юбілей гэтай падзеі, — расказала аўтар на сустрэчы з чытачамі.

На думку спадарыні Плескачэўскай, Францыск Скарына, хоць і нарадзіўся ў Полацку і ніколі пра гэта не забываў, быў усё ж чалавекам Еўропы. «Сёння, куды ні заедзеш, яго паўсюль лічаць сваім. Таму што ў XVI стагоддзі ён пражыў такое жыццё, да якога мы сёння павінны імкнуцца», — падкрэслівае журналістка.

Эксперты сыходзяцца на думцы, што гэты чалавек паўплываў не толькі на славянскі друк, але і ў цэлым на еўрапейскі. Напрыклад, тытульныя лісты да Францыска не рабіў ніхто. Таксама ён быў першы, хто не пасаромеўся размясціць свой партрэт у кнігах, якія выдаваў.

Аднак галоўная мэта «Гістарычных прагулак» — не проста паказаць веліч асобы, а разгледзець за вечнымі справамі жывога чалавека.

— У выданні шмат фота, яны перадаюць атмасферу гарадоў, дзе Скарына жыў, вучыўся і працаваў. Ідзеш па завулках, па якіх хадзіў Францыск, і здаецца, быццам ён зараз вынырне з-за рага. Мы імкнуліся зрабіць акцэнты на дробязях. Напрыклад, у Падуі ў той аўдыторыі, дзе будучы першадрукар здаваў экзамены, цудоўна захавалася арыгінальная столь. Дагэтуль журналісты, якія пісалі пра падуанскі перыяд Скарыны, не ведалі дакладнага месца іспытаў. Але мы былі настойлівыя: мясцовыя ў архівах адшукалі інфармацыю, і цяпер чытачы могуць на ўсе сто зазірнуць у мінулае.

Сапраўдным адкрыццём кнігі стала бібліятэка невялічкага гарадка Герліц на нямецка-польскай граніцы. Менавіта там быў знойдзены скарынаўскі канвалют (некалькі кніг пад адной вокладкай).

— 11 арыгінальных фаліянтаў у цудоўным стане мы не бачылі вельмі даўно. А захаваліся яны добра, бо ў Германіі кнігі, надрукаваныя кірыліцай, папытам не карысталіся, да іх стагоддзямі ніхто не дакранаўся.

Для каго друкаваў свае кнігі Скарына? Гэтае пытанне хвалюе літаратуразнаўцаў і звычайных чытачоў. Літоўскія і польскія эксперты сцвярджаюць, што хоць і пражыў ён большую частку жыцця за мяжой, але працаваў для свайго народа, беларусаў, з мэтай іх асветніцтва. Па-першае, кнігі былі на старабеларускай мове. Па-другое, яны толькі выглядалі на еўрапейскі манер, іх змест адпавядаў традыцыі праваслаўных хрысціян. Да таго ж вядома, што сам Скарына пісаў літургіі і акафісты.

**Ганна КУРАК.**

# Жураўлі лятуць да журавін


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПРА ЯГАДЫ

Свята — пляцоўка для людзей, якія займаюцца экалагічнымі праблемамі, і тых, хто стварае ўмовы для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Сёлета фестываль набыў новы імпульс — стаў часткай вялікага праекта «Разам для грамады і прыроды: узмацненне працэсу развіцця ў Мёрскім раёне праз супрацоўніцтва мясцовай улады і грамадзянскай супольнасці». Праект рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза і скіраваны на паляпшэнне жыцця жыхароў Мёршчыны на аснове рэалізацыі прынцыпаў устойлівага развіцця. Форум з такой значнай місіяй прыцягвае і замежных гасцей — наведалі свята члены мясцовага самакіравання з Латвіі, Расіі, супрацоўнікі прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі.

«Гэта пляцоўка існуе для таго, каб, будучы прамысловыя прадпрыемствы, робячы пэўныя рэчы ў сельскай гаспадарцы, мы не парушалі экалагічны баланс — тое, што мы павінны зберагчы для сваіх праўнукаў», — сказаў **старшыня Мёрскага раённага выканаўчага камітэта Ігар КУЗНЯЦОЎ.**

Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, у гарадскім парку «Паўвостраў» сабралася шмат жыхароў не толькі горада, але і вёсак раёна. Многія з іх — пераможцы конкурсаў па добраўпарадкаванні, па зборы журавін, па ўтрыманні сельскіх падворкаў. Узнагародзілі таксама найлепшых старшынь вуліц і вёсак Мёршчыны. Пераможцаў фотаконкурсу адзначыла раённая газета.

Для гасцей падрыхтавалі творчую праграму: выступілі калектывы раёна, госці з Латвіі і фольк-гурт PAWA. Майстры рэгіёна падрыхтавалі палаткі з разнастайнымі хэндмэйд-вырабамі для «Жураўлінага кірмашу — 2019». Адзначу добрую інфраструктуру свята: смакаты і гарачыя напоі можна было набыць у палатках грамадскага харчавання і ў сучасных фудтраках. Але ў прыярытэце, канешне, былі журавіны. На кірмашы былі булкі, пірагі, мармелад, джэмы з гэтых ягад, журавіны з імбірам, журавіны ў цукровай пудры і шмат іншых пачастункаў. «Каралеву» свята прадавалі і ў неапрацаваным выглядзе. У сярэднім кілаграм ягад з экалагічна чыстага рэгіёна каштаваў чатыры рублі.

## ПРА ПТУШАК

Далучылася да свята і грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Арнітолагі запрашалі паназіраць за чырвонакніжнымі птушкамі, жураўлямі, у палях. На гэтую вандроўку адправілася і я, даведаўшыся, адкуль адбываюць арганізаваныя аўтобусныя групы. Пляцоўку для назірання кіроўца знайшоў не адразу. Арнітолагі рупліва прыхавалі ўстаноўленыя біноклі за стагамі сена, ды і самі размясціліся там жа. Такая канспірацыя — неабходны элемент назірання за палахлівымі птушкамі. Пакуль ахвотныя па чарзе падыходзілі да бінокляў і ўзіраліся ў бяскрайнія прасторы, я запытала ў спецыяліста, што балотныя птушкі робяць у полі.

«Жураўлі цяпер кормяцца на палях. У іх асенняя міграцыя. Зараз сабраліся ў вялікія чароды для міграцыі ў Ізраіль, Афрыку і набіраюцца сілы перад дарогай. Падчас палёту яны таксама робяць перапынкі, але не такія вялікія. Птушкам галоўнае — на гэтай тэрыторыі набраць вагу і потым спакойна ляцець. У іншых краінах іншыя ўмовы, і не заўсёды знойдзеш месца, дзе магчыма паесці так добра», — паведаміла **спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Яўгенія ЛУЧЫК.**

Вярнуўшыся на пляцоўку свята, мне ўдалося напрасіцца на экскурсію на славутае балота Ельня. Гідам і спадарожнікам згадзіўся быць дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр Вінчэўскі. Ён адразу запытаў, ці ёсць з сабой боты. Адкуль? Збіралася выключна на гарадское свята. Але Аляксандр успомніў, што дзесьці ў машыне ёсць пара. Абуўшы на свой 37-ы боты 43-га, адправілася ў падарожжа.

Ад горада да пачатку экасцежкі кіламетраў дзесяць. Каб трапіць на мошчаную дошкамі сцежку па балоце, давялося перадолець амаль кіламетр размяклай пад дажджом лясной дарогі. І тут боты прыйшліся дарэчы.

У падарожжы Аляксандр Вінчэўскі расказаў, што журавіны і жураўлёў аб'ядноўвае не толькі свята ў Мёрах. Агульны корань словы маюць у беларускай і англійскай мовах. Назва журавін (Cranberry) у перакладзе азначае «жураўліная ягада». Такую назву далі, таму што доўгія, тонкія кветкі журавін нагадваюць галаву і дзюбу жураўля.

«Чаму на балота ляцяць жураўлі? Яны важаць тры-чатыры кілаграмы. Зразумела: любы драпежнік хоча іх злавіць, таму даводзіцца начаваць у вадзе, на мелкім возеры. Стоячы ў вадзе, яны чуюць усплёскі, калі, напрыклад, ліса падыходзіць», — расказаў пра мудрых птушак мой гід.

Ідучы па экасцежцы, мы сустрэлі шмат спадарожнікаў і арганізаваныя турыстычныя групы. Калі вы завітаеце на Ельню без гіда — у дапамогу вам стэнды на працягу шляху, якія апавядуць пра балота і раскажуць, на якія асаблівасці экасістэмы неабходна звярнуць увагу.

Балота Ельня — унікальнае месца. Яно дапамагала людзям падчас вайны. На астравах хаваліся яўрэйскія сем'і, а на лёдзе возера партызаны арганізавалі аэрадром. Сёння Ельня (адзін з найбуйнейшых паглынальнікаў вуглякіслага газу) запавольвае пацяпленне клімату і дае прытулак шматлікім знікаючым відам раслін і птушак.

«Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць...» І насамрэч радуе, што многія беларусы ўсё часцей для адпачынку выбіраюць не замежныя курорты, а родныя мясціны. А народныя гулянні, інфраструктура прыродных багаццяў даюць магчымасць пазнаёміцца з роднай зямлёй яшчэ бліжэй.

**Марыя ДАДАЛКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## На слыху

### У ПЕТЛЯХ — ДВА ЛАСІ

**44 пятлі для здабычы капытных устанавіў паляўнічы-нелегал у ваколіцах вёскі Чаронка Шумілінскага раёна. У дзве з іх трапілі ласі. Аднаго ўдалося выратаваць — яго своечасова заўважылі і вызвалілі дзяржінспектары, другі лось загінуў.**

У гэтых глухіх і багатых на дзічыну мясцінах рэйдавая група Гарадоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету аказалася невыпадкова. Яе работнікі атрымалі інфармацыю, што адзін з мясцовых жыхароў, які раней ужо двойчы прыцягваўся да адказнасці за браканьерства, зноў ставіць петлі ў лесе.

Агледзеўшы месца незаконнага палявання, інспектары разам са следча-аператыўнай групай адправіліся да падазраванага. У яго на падворку выявілі восем петляў з тых жа матэрыялаў, што і знойдзеныя ў лесе. Мужчына прызнаўся, што ставіў петлі для здабычы лася і дзіка. Паляўнічага-нелегала ўзялі пад варту.

### ЗАМЕСТ КАЧКІ ПАДСТРЭЛІЎ САХАТАГА

**Раніцай супрацоўнікі Мазырскай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету атрымалі інфармацыю пра незаконнае паляванне на тэрыторыі ўгоддзяў Калінкавіцкага лясгаса. Егер гаспадаркі выявіў на полі каля вёскі Вялікія Аўцюкі прыкапаныя рэшткі лася.**

На вынятай шкуры выявілі некалькі шротавых адтулін. Браканьерам мог аказацца паляўнічы з сезоннай пуцёўкай на птушку. Аб'яднаўшы намаганні са следча-аператыўнай групай, інспектары вырашылі праверыць паляўнічых у навакольных вёсках.

У аднаго з жыхароў вёскі Гулевічы, сапраўды, на верандзе знайшлі мяса лася агульнай вагой 153 кілаграмы. Мужчына з'яўляецца паляўнічым і мае зарэгістраваную стрэльбу. Ён прызнаўся ў незаконнай здабычы жывёлы. У дачыненні да падазраванага распачата крымінальная справа, прычыненая прыродзе шкода ацэньваецца ў 7650 рублёў.

### АГАРОДНІКІ ПАТРАПІЛІ Ў ЗВОДКІ

**У Калінкавіцкім раёне дзяржінспектары затрымалі зборшчыкаў канапель. І знайшлі месца, дзе тыя збіралі расліны, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Падазронь «гербарый» выявілі работнікі Мазырскай міжраёнінспекцыі ў аўтамабілі, спыненым для праверкі каля вёскі Агароднікі. У машыне ехалі трое мужчын, усе жыхары Хойнікаў, у багажніку аўто яны перавозілі два пакеты, напоўненыя свежасабранымі раслінамі — меркавана, дзікарослымі каноплямі.

Непадалёк ад месца, дзе спынілі іх аўтамабіль, пазней праваахоўнікі выявілі поле з забароненымі дзікаросамі плошчай каля 0,5 гектара. Канфіскаваныя расліны адправілі на экспертызу. Мужчынам пагражае крымінальная адказнасць за незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Организатор аукциона: комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, тел.: (017) 289 11 27, (017) 200 20 89, (017) 222 44 69.

Аукцион состоится 24 октября 2019 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

На аукцион выставляется:

| | |
|---|---|
| Сведения о предмете аукциона, место нахождения недвижимого имущества | Недвижимое имущество по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания.<br>В состав недвижимого имущества входят:<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-14640 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания), расположенное по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске, составные части и принадлежности: проезд, две дорожки, шесть площадок, ограждение, ворота, калитка, бордюрный камень. Общая площадь капитального строения составляет 750,4 м$^2$; год постройки – 1959;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1021086 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), расположенное по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске (КК-1-КК-сущ.), протяженность – 33,4 м; составные части и принадлежности: трубопровод хозяйствено-бытовой канализации, колодец; год ввода в эксплуатацию – 1959;<br>- насаждения ограниченного пользования. |
| Начальная цена предмета аукциона | 187 517 рублей 98 копеек, из них: начальная цена недвижимого имущества – 48 977 рублей 87 копеек (с понижением на 80 %), начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 138 540 рублей 11 копеек |
| Продавец недвижимого имущества | Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «МИНСКЭНЕРГО», тел. (017) 218 42 97.<br>Осмотр имущества потенциальными покупателями производится с участием представителя продавца Борисика Георгия Владимировича – тел.: (017) 246 17 67, (029) 344 01 31; Карасевой Ирины Ивановны – тел.: (017) 246 18 21, (029) 344 01 38; Юневич Оксаны Владимировны – тел. (029) 102 21 65 |
| Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества | Земельный участок площадью 0,4314 га с кадастровым номером 500000000002006563 (в том числе 0,4314 га с ограничениями в использовании земель, находящихся в санитарно-защитных полосах водоводов, и 0,1026 га с ограничениями в использовании земель, находящихся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений);<br>вид вещного права на земельный участок – право аренды;<br>срок аренды – 5 лет (со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признании аукциона несостоявшимся) |
| Условия, связанные с использованием земельного участка, а также иные условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:<br>использовать объект под размещение учреждения образования;<br>в течение двух лет со дня государственной регистрации перехода права собственности на объект покупателю разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство (реконструкцию) объекта и приступить к началу строительства (реконструкции) объекта в соответствии с разработанной и утвержденной в установленном порядке проектно-сметной документацией по объекту;<br>строительство (реконструкцию) объекта осуществить в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией в пределах установленных нормативных сроков;<br>в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды данного земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;<br>обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>при продлении срока аренды земельного участка до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права |
| Условия продажи недвижимого имущества | Покупателю использовать объект под размещение учреждения образования;<br>в течение двух лет со дня государственной регистрации перехода права собственности на объект покупателю разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство (реконструкцию) объекта и приступить к началу строительства (реконструкции) объекта в соответствии с разработанной и утвержденной в установленном порядке проектно-сметной документацией по объекту;<br>строительство (реконструкцию) объекта покупателю осуществить в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией в пределах установленных нормативных сроков;<br>покупателю возместить затраты, понесенные РУП «МИНСКЭНЕРГО» на изготовление технической документации, проведение независимой оценки зеленых насаждений, в сумме 1 808 рублей 31 копейка путем перечисления денежных средств на расчетный счет BY24BPSB30121002290139330000. Дополнительный офис № 701 на Чкалова Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», ул. Чкалова, 18/1, БИК: BPSBBY2X, УНП 100071593 |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 37 500 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Минского городского исполнительного комитета.<br>Назначение платежа – **задаток для участия в аукционе** |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 22 октября 2019 г. до 16.00.**

